PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

http://niva.iig.pl
redakcja@niva.iig.pl

№ 1 (2486) Год XLIX Беласток, 4 студзеня 2004 г. Цана 2,00 зл.

У Польшчы і Фінляндыі

Яўген Мірановіч

Больш за дзесяць гадоў парламент III Рэчы Паспалітай рыхтуе Закон аб нацыянальных меншасцях. Прадбачваецца ў ім магчымасць карыстання роднай мовай грамадзянамі няпольскай нацыянальнасці ў кантактах з лакальнымі ўладамі. Але пакуль гэты закон стане фактам, невядома ці будзе каму дэманстраваць сваю іншасць сярод палякаў. Мабыць, беларусаў, немцаў ці літоўцаў стане столькі, колькі цяпер татараў ці караімаў. Гэтыя апошнія паказваюцца як праява шматкультурнасці нейкай правінцыі і талерантнасці пражываючага там люду.

У Беластоку тым часам карыстанне беларускай мовай на вуліцы, у аўтобусе ці краме некаторымі лічыцца праявай адвагі, іншымі — шаленства, а яшчэ іншымі — правакацыі, якая можа выклікаць агрэсію з боку найбольш талерантнай нацыі. Некаторыя маюць нават праблему, каб набыць доўгачаканую „Ніву" з календаром. Знаёмыя адкрыта заяўляюць, што баяцца рэакцыі крэсавых патрыётаў у некаторых газетных кіёсках, якія на лозунг „Ніва" пагардліва крычаць: „Nie ma", або кідаюць у маўчанні. У іншых краінах Сярэдняй Еўропы пытанне карыстання нацыянальнымі меншасцямі сваёй роднай мовай вырашылі найчасцей ужо на пачатку дзевяностых гадоў. У Нямеччыне, у Саксоніі і Брандэнбургіі, у гмінах дзе пражывае сербская меншасць назвы мясцовасцей, дзяржаўных устаноў, аб'явы пра выбары, інфармацыйныя паведамленні друкуюцца на дзвюх мовах. На сербскай можна звяртацца ў адміністрацыйныя і судовыя ўстановы.

У Аўстрыі меншасцямі лічацца славенцы, харваты, італьянцы, чэхі, славакі і ромы. У мясцовасцях, у якіх меншасці складаюць прынамсі 25 працэнтаў насельніцтва, карэспандэнцыю з мясцовымі ўладамі можна весці на сваёй мове. Такое на практыцы адбываецца ў правінцыі Карынтыя, дзе на тэрыторыі трох паветаў славенская мова з'яўляецца афіцыйнай побач нямецкай. У правінцыі Бургеланд такія прывілеі маюць, мадзьяры а ў Штырыі — харваты.

У Славеніі дапаможнымі мовамі ў справаводстве з'яўляюцца венгерская і італьянская. Гэтыя меншасці маюць фактычна культурную аўтаномію. Тапаграфічныя назвы падаюцца, а лакальная адміністрацыя, судовыя ўстановы ў паветах, дзе пражываюць італьянцы і венгры, працуюць на мове гэтых народаў. У славенскім парламенце дэпутаты ад меншасцей могуць выступаць на сваіх мовах.

У 2000 годзе сваё дыскрымінацыйнае заканадаўства памянялі нават румыны, дазваляючы меншасцям, якіх у гмі-

[працяг ☞ 2]

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Айцец Рыгор Сасна і матушка Антаніна Троц-Сасна

Ад 1980 года — з „Нівай"

Нестандартная ікона

Міра Лукша

Больш за сорак гадоў айцец Рыгор Сасна — святар. Усе гэтыя гады святарскую паслугу спалучае з навукова-даследчыцкай працай. Адкрывае праваслаўную гісторыю Падляшша, збірае бібліяграфію на гэтую тэму. З кожным годам папаўняе бібліяграфію Усходняга хрысціянства ў Польшчы. Перад доктарам айцом Рыгорам Сасной (доктарская дысертацыя *Гісторыя праваслаўных прыходаў Беласточчыны ў межах сённяшняй Варшаўска-Бельскай епархіі)* стаяць адкрытыя бібліятэкі ды архівы Падляшша, Мінска, Масквы. Разам з Дарафеем Фіёнікам выдаў чатыры манаграфіі праваслаўных прыходаў (Орлі, Бельска, Рыбалаў і Пасынак), з матушкай Антанінай — манаграфію прыхода ў Жэрчычах. Матушка Антаніна таксама ўключылася ў даследчыцкую працу айца Рыгора. Выйшлі з друку кніга пра святыя месцы і цудоўныя іконы на Беласточчыне, кніга пра былыя прыходы паміж Нарваю і Бобрай. Паявілася кніга пра лёс нашых ікон, якія ў выніку розных ліхалецтваў расцярушыліся па свеце — *Święte miejsca i cudowne ikony*. Атрымалі яны разам Узнагароду імя брата Альберта (Адама Хмялёўскага) за 2001 год *за дасягненні ў галіне дакументавання гісторыі і дзейнасці праваслаўнае Царквы*. У 2003 г., разам з пяццю іншымі праваслаўнымі асобамі заслужанымі ў экуменічнай і грамадскай дзейнасці з рук шэфа кабінета прэзідэнта РП атрымалі ордэны і адзнакі: Афіцэрскі крыж Ордэна адраджэння Польшчы — настаяцель царквы ў Рыбалах (ад 1987 года), гісторык а. Рыгор Сасна, а Залаты крыж заслугі — Антаніна Троц-Сасна, адзначаная з мужам за навукова-выдавецкую дзейнасць у галіне прадстаўлення гісторыі праваслаўных парафій і храмаў на Падляшшы. „Наша жаданне, — казаў айцец Рыгор Сасна, — калі будзе Божае блаславленне, выкарыстаць сабраны архіў і бібліятэку дзеля перадачы сваім людзям і Царкве нашага даробку ў памяць нашай Царквы і праваслаўных людзей Беласточчыны". Зазначае, што Божая воля наводзіла яго на спатканне добразычлівых людзей, якія спрыялі здзяйсненню яго зацікаўленняў. Удзячны ён прафесару Васілю Чачузе, у свой час старшыні Беластоцкага навуковага таварыства (з яго дапамогай выйшла ў 1984 г. першая кніга: *Bibliografia parafii prawosławnych na Białostocczyźnie. Część alfabetyczna)*, мітрапаліту Саву, навуковым супрацоўнікам Інстытута славяназнаўства Акадэміі навук у Маскве, супрацоўнікам Нацыянальнай бібліятэкі ў Мінску, рэдактарам *Przeglądu Prawosławnego*, працаўнікам „Orthdruku", таксама і „Ніве" (ад 19.10.1980 г.), якая па інспірацыі Міколы Гайдука некалькі гадоў вяла бібліяграфічны куточак і занатоўкі пра цэрквы — цыкл „Помнікі культуры". Сотні публікацый у розных выданнях. Справай, якой займаецца бацюшка Рыгор, не ў навуковым кабінеце, а побач сваёй душпастырскай службы, у іншых месцах гэта заданне для 10-15 чалавек у інстытутах. „Першы дарадчык і рэцэнзент" ягоных навуковых прац — матушка Антаніна...

Самая свежая кніга а. Рыгора і м. Антаніны — манаграфія жаночага манастыра Нараджэння Прасвятой Багародзіцы, якую выдала Царкоўнае брацтва трох святых іерархаў у Беластоку на

[працяг ☞ 3]

Віншуем нашых чытачоў з Калядамі! Жадаем Вам шчасця, здароўя, радасці ў жыцці і поспехаў ва ўсіх справах.

Рэдакцыя

У пошуках адлігі ☞ 2

Адам Эберхардт, адзін з суаўтараў кнігі „Беларусь і Польшча...", звярнуў увагу, што яна з'яўляецца пачаткам дыялогу. Нягледзячы на вялікія палітычныя разыходжанні, інтэнсіўнасць узаемных кантактаў мізэрная і ёй патрэбны станоўчы штуршок. Пакуль гэта не ладзіцца ў вярхах, але ёсць спроба на аналітычным узроўні.

Каляда, каляда... ☞ 3

Выкананне каляднай гвязды з'яўляецца складаным дзеяннем, якім займаюцца малалікія асобы. Якуб Багацэвіч з Крывятыч штогод у снежні займаецца нарыхтоўкай казачна каляровых папярова-драўняных гвязд. Ён выконвае іх у той самай манеры як і даўней, як рабіў гэта яго дзедка.

Планы БАТ ☞ 5

Беларускае асветнае таварыства паўстала ў Беластоку ў 1999 годзе. Стараннем БАТ у 1999-2002 гадах у Падставовай школе № 11 па вул. Палескай вялося навучанне беларускай мовы, а разам з Цэнтрам праваслаўнай культуры ў 2000 г. арганізаваліся канікулярныя заняткі для дзяцей, якія наведвалі ўрокі роднай мовы.

Праваслаўныя дачыненні Віфлеема ☞ 9

Першыя хрысціяне паставілі над яслямі дом малітвы. У 326 годзе за ахвяраванні імператара Канстанціна Вялікага і ягонай маці Галены пабудавана была вялікая пяцінефавая базіліка, якая вытрымаўшы бурлівыя стагоддзі пажараў, нападаў, грабяжоў і перабудоў, на сённяшні дзень астаецца месцам служэння праваслаўнай Літургіі.

Новы маркет ☞ 11

Адкрыццё новага магазіна ў Гайнаўцы супала са святкаваннямі васьмідзесяцігоддзя кааператыва „Сполэм". Новы магазін займае плошчу звыш 1600 квадратных метраў. У ім знайшло работу каля 30 асоб, а ўся інвестыцыя, якая рэалізавалася 4 месяцы, каштавала каля 3 млн. зл.

9 770546 196000

Беларусь — беларусы

У пошуках адлігі

Польскі інстытут міжнародных спраў у Варшаве наладзіў 9 снежня 2003 года прамоцыю кнігі „Беларусь і Польшча — Polska i Białoruś".

Мерапрыемства ўдастоіў прысутнасцю старшыня сеймавай Камісіі замежных спраў прафесар Ежы Яскерня. Звярнуў ён увагу на важнасць беларуска-польскіх узаемаадносін. Складаныя пытанні дзяржаўнага ладу Беларусі ўскладняюць яе адносіны з еўрапейскімі суседзямі. Асабліва Польшча зацікаўлена ўладкаваннем гэтых адносін, пошукамі таго, што яднае, спрыянню дэмакратызацыі Беларусі. Гэтая праблема стаўляецца і ў Камісіі, і ў іншых органах; гэта вялікі выклік польскай замежнай палітыкі. Галоўныя пытанні, якія ставіць польскі бок, гэта:

— дыягназ стану двухбаковых адносін: што можна зрабіць;

— што трэба рабіць для спрыяння вяртанню Беларусі ў міжнародную супольнасць;

— якія ёсць абумоўленасці фарміравання рацыянальнай замежнай палітыкі.

Прафесар Уладзімір Астапенка з Цэнтра міжнародных даследаванняў БДУ мяркуе, што ў кнізе дастаткова эфектыўна ўдалося разгледзець цэлы комплекс праблем, якія маюцца ў польска-беларускіх адносінах.

Адам Эберхардт, адзін з суаўтараў кнігі, звярнуў увагу, што яна з'яўляецца пачаткам дыялогу. Нягледзячы на вялікія палітычныя разыходжанні, інтэнсіўнасць узаемных кантактаў мізэрная і ёй патрэбны станоўчы штуршок. Пакуль гэта не ладзіцца ў вярхах, але ёсць спроба на аналітычным узроўні.

Кніга „Беларусь і Польшча..." ўмяшчае даклады (на польскай і беларускай мовах), зачытаныя польскімі і беларускімі палітолагамі на канферэнцыі, ладжанай ПІМС у маі 2003 года. На гэтай канферэнцыі былі ўзяты пад разгляд шэсць тэмаў; кожнай з іх прысвечаны два даклады: польскі і беларускі аспект пытання. Разглядаліся наступныя тэмы:

— польска-беларускія адносіны;

— уплыў пашырэння Еўрасаюза на польска-беларускія адносіны;

— беларуска-расійская інтэграцыя і яе ўплыў на адносіны Беларусі з Еўрасаюзам;

— эвалюцыя НАТА і яе паслядоўнасці;

— роля Польшчы ў ладжанні адносін Еўрасаюза з краінамі СНД;

— еўрарэгіёны польска-беларускага памежжа.

Найбольшай, аднак, як мне здаецца, праблемай з'яўляецца пытанне вызначэння і самавызначэння Беларусі. На працягу дзесяткаў гадоў савецкія ўстановы, у іх ліку і дэкларатыўна навуковыя, пільна працавалі ў напрамку абясцэньвання яе тоеснасці так насельніцтвам, як і вонкавымі назіральнікамі. Сённяшняя беларуская дзяржава па сутнасці не мае ўласных палітычных вектараў, тае дынамікі, якая фарміравала б яе нейкі сэнсоўны кшталт. І не толькі непрадбачлівыя паводзіны Лукашэнкі ўскладняюць, мякка кажучы, адносіны Беларусі з суседзямі, але і разгубленасць тых суседзяў. Не надта вялікім выключэннем тут і Польшча, якая ў замежнай палітыцы намагаецца шчыльна трымацца „Вялікага брата". А асабліва аўтарытэтны ў Польшчы амерыканскі палітолаг Збігнеў Бжэзінскі ў сваіх усходнееўрапейскіх аналізах зусім ігнаруе існаванне дзяржавы Беларусь...

Хочацца верыць, што кніга ўсё ж такі дасць нейкі станоўчы зрух у польска-беларускіх дачыненнях. Хаця польскія даклады прыпраўлены патэрналізмам, хаця на прамоцыі не было нікога з беларускага варшаўскага дыппрадстаўніцтва...

Аляксандр Вярбіцкі

Show must go on

Новы год Беларусь сустракае з новым прэм'ерам і новым дзяржаўным бюджэтам, які быў прыняты настолькі хутка, што некаторыя дэпутаты, па іх уласных сведчаннях, не паспявалі сачыць за ходам абмеркавання. Хаця, калі шчыра, галоўны фінансавы дакумент краіны беларускія парламентарыі са спрынтэрскай хуткасцю прымаюць не першы год. Такая асаблівасць працы над бюджэтам усталявалася ад 1996 года.

Але ў чарговы раз кранаць гаротную, мала кім прызнаную Палату прадстаўнікоў і яе паўнамоцтвы няма ніякага жадання. Здаецца, толькі лянівы не наракаў на „кішэннасць" беларускіх парламентарыяў, цалкавітай падпарадкаванасці іхніх рашэнняў адміністрацыі А. Лукашэнкі.

Больш цікавай падзеяй апошняга месяца 2003 года стала прызначэнне 19 снежня Сяргея Сідорскага прэм'ер-міністрам. У чымсці яна знакавая.

Цягам амаль паўгода Беларусь існавала без кіраўніка ўрада. Пасля гучнай, але ў той жа час малаабгрунтаванай, ліпеньскай адстаўкі Генадзя Навіцкага, вышэйзгаданы С. Сідорскі быў прызначаны выконваючым абавязкі прэм'ера. За час свайго фактычнага кіраўніцтва ўрадам гэты спадар вызначыўся, як адзначаюць аналітыкі, жорсткім стаўленнем да розных сур'ёзных эканамічных пытанняў. Гэта, у першую чаргу, тычыцца пераходу Беларусі на расійскі рубель і прыватызацыі манапаліста газавай сістэмы краіны „Белтрансгазу". Па вялікаму рахунку, жорсткасць у стаўленні вызначалася і вызначаецца не столькі адносінамі самога Сідорскага да гэтых праблем, колькі паслядоўным правядзеннем лукашэнкаўскай лініі на недапушчэнне ў Беларусь расійскага капіталу. Вядома, у разуменні набыцця расіянамі таго, што фармальна з'яўляецца дзяржаўным, а па сутнасці належыць цяпер дзеючаму прэзідэнту.

У прынцыпе, сам С. Сідорскі і не адмаўляе ў сваёй адданасці прэзідэнту. Нездарма менавіта яго А. Лукашэнка і прапанаваў на пасаду прэм'ера. Трэба адзначыць, што новы кіраўнік урада заняў сваю пасаду не толькі без наяўнасці ўласнай палітычнай праграмы дзеянняў, але нават і не даючы справаздачу перад дэпутатамі за пяць месяцаў працы на месцы выконваючага абавязкі. Гэтыя моманты, а таксама і забарона шэрагу журналістам праз прэзідэнцкую адміністрацыю прысутнічаць на пасяджэнні парламента, дзе адбывалася зацвярджэнне кандыдатуры новага прэм'ера, указваюць на фармальнасць усёй працэдуры. Больш таго, з выступлення Лукашэнкі трэба разумець, што за хібы ў эканоміцы разам з новапрызначаным кіраўніком прыйдзецца адказваць усяму ўраду.

Але ўсяму ці не ўсяму гэта яшчэ пытанне, бо калі зважаць на ліпеньскую прэзідэнцкую пагрозу адказу за правалы, усе адстаўленыя члены папярэдняга складу ўраду атрымалі не горшую дзяржаўную працу. Можа што значна спакайнейшую. Той жа Навіцкі стаў кіраўніком вышэйшай палаты парламента — Савета Рэспублікі.

Сярэдзіна снежня для эканомікі Беларусі вызначылася таксама ўзнаўленнем перамоў з расійскім урадам аб пастаўцы ў краіну таннага газу. Ідуць яны цяжка. Расія звязвае пастаўкі па ўнутрырасійскіх коштах з прыватызацыяй „Белтрансгазу" па сваёй цане. На момант напісання артыкулу невядома, якім стане вынік. Але па ўсяму відаць, што прызначэнне жорсткага правадніка лукашэнкаўскай лініі прэм'ерам указвае на дэманстратыўнае нежаданне ісці на саступкі расіянам. Каму ад гэтага будзе горш пакуль невядома. Рост цэн на газ і далейшыя негатыўныя вынікі кансервацыі адміністратыўна-камандных метадаў кіравання беларускай эканомікай прымусяць хутка знайсці „вінаватага", каб гучна і ўсенародна яго пакараць.

„Усе будуць несці адказнасць перад народам, — сказаў А. Лукашэнка ў адрас новага складу ўраду, — у тым ліку і кіраўнік дзяржавы, які будзе даваць справаздачу на з'ездзе". Што гэта за з'езд і калі ён адбудзецца — нікому невядома, але show must go on. Значыць — будзем чакаць з'езда.

Уладзімір Лапцэвіч

Уласны будынак Пасольства Беларусі ў Варшаве

16 снежня 2003 года ў Варшаве падпісаны дагавор аб набыцці нерухомасці пад сядзібу Пасольства Беларусі ў Польшчы. Рэспубліка Беларусь набыла права ўласнасці на ўчастак зямлі ў Варшаве агульнай плошчай 1 472 кв. м. і новы трохпавярховы будынак з падземным гаражом алульнай плошчай 2 645 кв. м.

Дагавор падпісалі надзвычайны і паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча Павел Латушка і ўпаўнаважаны прадстаўнік Акцыянернага Таварыства „Эксбуд-Сканска" Ян Петэрсан.

Варшава заставалася па сутнасці адзінай сталіцай суседняй краіны, дзе Беларусь не мела ўласнасці будынку для дыпламатычнага прадстаўніцтва.

Ад 1992 года Пасольства Беларусі ў Польшчы арандуе будынак у польскага дзяржаўнага прадпрыемства „Дыпсервіс". Ад 2001 года арандуецца таксама асобны будынак і для консульскай службы Пасольства.

Набыццю нерухомасці папярэдчала дэталёвае знаёмства з шэрагам аб'ектаў нерухомасці ў Варшаве. У выніку было прынята рашэнне аб набыцці будынка па вуліцы Вяртнічай, 38, у адным з найбольш прэстыжных раёнаў сталіцы Польшчы — Вілянаве, на так званым „каралеўскім шляху", які спалучае былую летнюю рэзідэнцыю польскіх каралёў і Стары горад Варшавы.

Гэты новы сучасны будынак збудавала вядомае ў Польшчы будаўнічае Акцыянернае Таварыства са шведскім капіталам „Эксбуд-Сканска". Пры ўзвядзенні гмаху выкарыстаны навейшыя архітэктурныя, тэхнічныя і будаўнічыя рашэнні. Па ўзгадненню з Пасольствам фірмай „Эксбуд-Сканска" за ўласны кошт на працягу бліжэйшага часу будуць праведзены неабходныя адаптацыйныя працы (падрыхтоўка памяшканняў для консульскай службы і ўстанаўленне агароджы і вясной 2004 года Пасольства Беларусі ў Польшчы пачне дзейнічаць у новай сядзібе.

Прэсавы бюлетэнь Пасольства РБ у Польшчы

У Польшчы і Фінляндыі

[1 ☞ працяг]

не прынамсі 20 працэнтаў, на поўнае карыстанне роднай мовай. Такім чынам дамінуючая ў Сямігорадзе венгерская нацыянальнасць атрымала ўмовы для стварэння культурнай аўтаноміі.

На тэрыторыі Венгрыі меншасці ад пачатку дзевяностых гадоў атрымалі шырокія правы для развіцця свае мовы і культуры, але там этнічныя супольнасці таксама невялікія і моцна асіміляваныя як у Польшчы. Фактычна пражываючыя сярод мадзьяраў балгары, румыны, сербы, славакі, украінцы ці немцы могуць выступаць у самаўрадах і парламенце на сваіх мовах, але гэта не адбываецца таму, што ніхто іх туды не выбраў.

У Славакіі закон дазваляе меншасцям, якіх у гмінах прынамсі 20 працэнтаў, карыстацца роднай мовай. Улады саставілі нават рэестр такіх мясцовасцей. На мадзьярскай мове павінны быць названы вуліцы і ўстановы ў 513 мясцовасцях, на карпата-рускай — 68, на ўкраінскай — 18, на ромскай — 58.

У Беларусі паводле закону ад 1995 года ўсе правы, большыя нават чым карэнная нацыя, мае расійская нацыянальная меншасць. Але гэта асаблівы выпадак у Еўропе, калі меншасць вызначае правы для большасці.

Найлепшая сітуацыя для ўсіх нацыянальных меншасцей у Фінляндыі. Як меншасці выступаюць там шведы, татары, жыды, рускія, ромы. Але фактычна толькі шведы выступаюць як рэальная супольнасць. У гмінах, дзе меншасці складаюць 8 працэнтаў, справаводства вядзецца на дзвюх мовах. Такіх двухмоўных гмін — 42. На тэрыторыі 5 гмін выступае толькі адна мова — шведская, паколькі пражывае там менш за 8 працэнтаў фінаў.

Фінляндыя — краіна, якая не маючы натуральных рэсурсаў, ні спрыяльных кліматычных умоў, развіваецца найхутчэй у свеце. Найменшая там карупцыя і найбольш сумленныя чыноўнікі. Фіны не баяцца таксама, што гміны, у якіх справаводства вядзецца на шведскай мове, захочуць далучацца да шведскай дзяржавы. Фіны зразумелі тое, чаго зразуменне зусім не пад сілу палякам.

Яўген Мірановіч

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Паэтэса атрымала ад Яўгена Янчука букет чырвоных руж (абое ў цэнтры)

Літаратура – Айчына і могілкі

Кожная сустрэча Надзеі Артымовіч — асаблівая. Звычайна, пасля кароткай біяграфіі, паэтэса чытае выбраныя творы. Падборка і чарговасць ніколі не паўтараюцца. Гэта свайго роду камунікат. Часам адкрываюцца невядомыя біяграфічныя адрэзкі.

— Літаратура, — кажа Артымовіч, — гэта могілкі.

На пытанне, які ўплыў на яе творчасць мае свет памерлых, адказала:

— Я скажу як напісаўся мой першы верш. Гэта было напярэдадні 1 лістапада 1969 года. Я не паехала ў Бельск. У акадэміку апрача стоража ніхто не астаўся. Тады напісала мой першы верш „Ой ляцелі гусі". Пасля нейкага часу я паслала яго ў „Ніву". Апублікавалі праз паўгода — якраз на 1 красавіка. Я не ведала тады, што абазначае такая публікацыя.

Неўзабаве, пасля дэбюту, атрымала ліст ад Сакрата Яновіча — пісаў: „Твой верш, гэта вырашэнне твайго лёсу — нялёгкага лёсу".

— Могілкі даюць магчымасць задумацца над сабой, — дадае Надзея Артымовіч.

* * *

Сустракаемся таксама ў пераходны дзень — на Запусты перад Піліпаўкай.

— У вашай школе я чацвёрты раз, — кажа Надзея Артымовіч. Першы раз завітала ў Гайнаўскі белліцэй яшчэ студэнткай.

— Хоць я сама вучылася ў Бельскім беларускім ліцэі, настаўніцкую практыку праходзіла ў вас, у спадара Васіля Сакоўскага, — успамінае. — Гэта было ў канцы 1960-х. Паколькі прысутныя ліцэісты і гімназісты яшчэ не нарадзіліся, інфармацыя падалася таксама як са „свету літаратуры".

Калі ідзе пра кантакт з чытачом — на аўтарскай сустрэчы паэтэса тут трэці раз, першы раз выступіла ў 1993 годзе па запрашэнні Клуба беларускіх спраў. Праз дзесяць год зноў завітала ў Белліцэй — і гэтым разам па-юбілярску. Шафёрам паэтэсы быў сам дырэктар, Яўген Сачко. Разам настаўнікі: Яўген Янчук і Янка Карчэўскі. І гэта не канец... Ужо перад Гайнаўкай іх аўто апярэдзілі тры паліцыйныя машыны на сігнале, і яны „суправаджалі" іх пад сам ліцэй.

Публіку склалі навучэнцы Гімназіі і Ліцэя, зацікаўленыя літаратурай, якія сяброўскім паўкругам заселі пад гістарычнай картай Беларусі.

* * *

Сустрэча вылучалася згушчаным задуменнем і пэўнай нясмеласцю з боку моладзі.

— Ахвотна адкажу на вашыя пытанні, — заахвочвала да размовы Надзея Артымовіч.

Ліцэісты і гімназісты, у сваю чаргу, прасілі прачытаць ім вершы. На гэты раз Надзея Артымовіч прэзентавала творы са зборнікаў „Сезон у белых пейзажах" і „Лагодны час", таксама польскія пераклады.

— А можаце прачытаць яшчэ раз верш пра Бельск і кропелькі дажджу? — пачуўся голас з круга. Сучасныя ліцэісты не маюць магчымасці набыць зборнік, усе ранейшыя выданні трэба шукаць у бібліятэках, на паліцах кнігалюбаў. Моладзі астаюцца падручнікі, дзе адно выбраныя творы.

— Калі чытаем вашыя вершы, ліцэісты думаюць, што напісала іх маладая дзяўчына, — адзначыла настаўніца Іаланта Грыгарук. — Ідзе пра іх малады дух. І адначасова — стары.

На канец паэтэса атрымала з рук самавітага Яўгена Янчука букет чырвоных руж.

А на другі дзень пасля гайнаўскай сустрэчы (15 лістапада 2003 г.), калі паэтка прыехала на Беластоцкі універсітэт на сустрэчу са студэнтамі паланістыкі, паўтарыла і дадала:

— Літаратура гэта Айчына. Айчына і могілкі.

Ганна Кандрацюк

Каляда, каляда...

Ад якога часу калядоўшчыкі ходзяць ад хаты да хаты, дакладна невядома. Польскія пісаныя крыніцы падаюць, што гэты абрад склаўся ў сярэдневякоўі, а росквіт наступіў у XVII і XVIII стагоддзях. У праваслаўнай грамадскасці Польшчы калядаванне фарміравалася пад уплывам усходняй абраднасці.

У беларусаў слова „каляда" абазначае святочны цыкл ад Раждзества Хрыстова да Вадохрышча. На Беласточчыне гэтае слова адносіцца выключна да вячэры напярэдадні Раждзества, да Куцці.

На Падляшшы слова „каляда" абазначае таксама спецыяльна нарыхтаваны снапок жыта, які — згодна старому звычаю — стаўляецца ў Куццю ў кут вялікага пакоя пад іконай. Даўней гэты снапок — дзеля ўсялякага шанцавання і заможнасці ў доме — стаяў аж да Вадохрышча. Некаторыя гаспадары, як удалося мне даведацца ў Арлянскай гміне, саломай ад яго абвязвалі пладовыя дрэвы дзеля такога ўраджаю, як зярнят у калоссі. Іншыя гаспадары адрэзвалі каласы і давалі іх хатняй жывёле — курам, гусям...

Калядныя святы папярэджвае шасцітыднёвы пост Піліпаўка, у час якога даўней моладзь на вёсках вывучала калядныя песні адпаведныя для спявання ў пост і святочны калядны перыяд. Неад'емным атрыбутам народнай каляднай абраднасці ў праваслаўных з'яўляецца калядная гвязда — адзін з важнейшых сімвалаў Раждзества, апавяшчаючы з'яўленне на свет малога Хрыста.

Выкананне каляднай гвязды з'яўляецца складаным дзеяннем, якім займаюцца малалікія асобы. Якуб Багацэвіч, пенсіянер з Крывятыч, пастаянна — ад звыш пяцідзесяці гадоў — штогадова ў снежні займаецца нарыхтоўкай такіх казачна каляровых папярова-драўняных гвязд. Ён выконвае іх пастаянна ў той самай манеры як і даўней, як рабіў гэта яго дзедка. Для гэтага патрэбнае старое рэшата, ліпавыя калочкі, каляровая папера і клей. Для асвятлення сёння заміж свечак устаўляюцца малыя электралямпачкі. Так нарыхтаваная гвязда, прыводзімая ў кручэнне рукою, стварае ўражанне мігцеючага нябеснага радаснага руху і свяціла абвяшчаючага Вялікую Навіну. Спадар Багацэвіч штогадова атрымлівае па некалькі заказаў на гвязды: ад прыватных асоб, прыходаў, народных калектываў, а быў заказ і ад „Праваслаўнага агляду". Адна з ягоных шаснаццаціканцовых гвязд два гады таму перамагла ў конкурсным аглядзе і апынулася ў Этнаграфічным музеі ў Варшаве, а затым паехала ў Грэцыю. Гвязды Якуба Багацэвіча красуюцца таксама і ў замежных цэрквах — у Маскве, Роўным...

У Крывятычах, як расказалі мне найстарэйшыя жыхары вёскі — у санацыйны перыяд і зараз пасля вайны калядаваць хадзіла амаль уся вёска — уся кавалерка — па некалькі дзесяткаў чалавек разам са звыш дзесяццю гвяздамі. Праваднік (адзін з калядоўшчыкаў) спачатку пытаў гаспадара дазволу і толькі пасля згоды пачыналі спяваць. Пачыналі з прыпеўкі „Сёння Хрыстос нарадзіўся, усіх уцешыў. Мы Яго славіць хочам, вашу хату развесялім". Калядоўшчыкі хадзілі ад хаты да хаты, але дадому не ўваходзілі — стукалі ў акно; сёння ў многіх хатах у вокнах цёмна... Калядоўшчыкам людзі заўсёды давалі грошы, так як і сёння. Калядавалі нават да поўначы, а пасля ладзілі да белай раніцы забаву пад гармонік і бубен, з гарэлкай. У неадлеглым Збучы за закалядаваныя грошы моладзь на другі дзень заказвала малебен у царкве, у якую ехалі на санях, і толькі пасля малітвы быў супольны абед і забава да раніцы.

Фота МІХАЛА МІНЦЭВІЧА

Арлянскія калядоўшчыкі Юліта, Павел і Лявон Леўчукі

Цяпер у Крывятычах калядуюць толькі нямногія малыя дзеткі — дзве групы. Жыхары вёскі чулліва прыгадваюць колішні вясёлы час, калі на вясковай вуліцы было столькі калядоўшчыкаў, як на ярмарцы. Сёння ў свята вуліца пустая, людзі святкуюць паасобку. І яшчэ сказалі мне ў Крывятычах, што хаця шануюць там традыцыю, аднак з палёгкай успрымаюць той факт, што ад некалькіх ужо гадоў маюць пасля свята зацішак ад старых калядоўшчыкаў з іншых прыходаў, нават з гор (!), якіх шмат хадзіла збіраць грошы для сваіх царкоўных спраў; мабыць забаранілі ім гэта зверху.

У Малінніках даўней у святочны час хадзілі з г.зв. *Гэродам* (Ірадам). Сёння тую традыцыю прадаўжае адно толькі фальклорны калектыў „Малінкі" і то толькі на абрадных аглядах у гарадах. Радуе ўсё ж такі тое, што традыцыйнае каляднае мастацтва пакланення Усявышняму ў нашым народзе яшчэ не звялося.

Міхал Мінцэвіч

Нестандартная ікона

[1 ☞ працяг]

дзесяцігоддзе Жаночага манастыра Нараджэння Прасвятой Дзевы Марыі ў Беластоку. Як заўважыў епіскап Беластоцкі і Гданьскі Іакаў, кніга — не ўвядзенне ў сутнасць праваслаўнага манаства, а ілюстрацыя найнавейшай гісторыі праваслаўя на Беласточчыне, сведчанне духоўнага ажыўлення і Божага блаславлення для нашай Царквы. Гэта таксама запіс балючага былога, якое так часта бывае зафальшаваным і скрыўленым. Кніга прыбліжае гісторыю Жаночага праваслаўнага манастыра Нараджэння Прасвятой Дзевы Марыі ў Краснастоку, лёсы таго прыхода, лёсы Краснастоцкай іконы Божай Маці. Такім чынам гэтая манаграфія — запіс бурлівай гісторыі нашага рэгіёна.

Манастыр у Беластоку — непасрэдны спадчыннік традыцыі Краснастоцкага манастыра і стражнік памяці аб ім. Епіскап Іакаў мае надзею, што неўзабаве стане ён таксама важным паломніцкім цэнтрам і крыніцай духоўнага ўздыму. Дзякуе таксама аўтарам кнігі — айцу Рыгору і матушцы Антаніне — няўтомным хранікёрам нашага былога.

Міра Лукша

Архітэктурны помнік не загіне

З таго часу, як чыгуначную амбулаторыю ў Чаромсе перавялі ў іншае памяшканне, будынак пуставаў. Ніхто не хацеў узяць яго ў арэнду або купіць, бо будынак лічыцца помнікам архітэкутры і патрабуе рамонту. Стаіць ён у прывабліным месцы і таму былы радны Янка Кубіцкі прапанаваў войту добраўпарадкаваць сядзібу і арганізаваць парк адпачынку з пляцоўкай гульняў для дзяцей. Але ўладальнікі маёмасці — чаромхаўскія чыгуначныя начальнікі — неакуратна паставіліся да прапановы.

У снежні 2003 г. будынак купіў адвакат з Варшавы. Новы ўладальнік пачаў рамонт і абяцае давесці будынак да ранейшага выгляду. Распытваў ён жыхароў Чаромхі, як даўней выглядала памяшканне ўнутры і звонку. Значыцца, чаромхаўскі помнік архітэктуры не загіне. Хацелася б, каб падобнае памяшканне — будынак чыгуначнай станцыі ў Кляшчэлях — знайшоў такога гаспадара.

Апрача будынка амбулаторыі прададзена старадаўняя лазня, пабудаваная пры цары. Купілі яе таксама жыхары Варшавы — выхадцы з Чаромхі. (ус)

Умець чакаць свята

Каляды, якія звычайна асацыююцца са снегам, марозам, сямейнай атмасферай і калядаваннем, зараз набылі перад усім спажывецкі характар. Нешта нядобрага дзеецца ў духоўнай сферы, калі ўвага засяроджваецца перад усім на цацках, падарках, а не на духоўным вобліку Хрыстовага Нараджэння. Ну што ж, лёгкае і прыемнае больш прываблівае. Відаць, усё гэта і не даспадобы Усявышняму, які мусіць дадаткова ўглядацца ў адвечную спрэчку на Беласточчыне наконт таго, чыё Ражджаство больш праўдзівае: каталіцкае ці праваслаўнае? Адным з сур'ёзнейшых доказаў кожнага боку была прысутнасць снегу і марознага надвор'я ў час святкаванняў. Відаць, вырашыў Ён пакараць і адну, і другую канфесію, таму што ад некалькіх гадоў так блытае з пагодай у час святаў, што найбольш зацятыя канфесійныя экстрэмалы не могуць ёю пакарыстацца ў сваёй місійнасці. У канцы снежня пабываў я ў Белавежы і на панадворку знаёмага пабачыў прыгожа цвітучыя сіне-жоўта-чорныя браткі. „Гэта праз спутнікі і самалёты, што нарабілі дзірак у небе" — так усе прыродныя анамаліі і дзівосы тлумачыла трыццаць гадоў таму мая светлай памяці бабуля Вольга.

Самы важны ўспамін з майго дзяцінства звязаны са святамі Нараджэння Гасподняга датычыць хрысціянскай сціпласці ў штодзённым жыцці бабулі Олькі і ейнай аўтэнтычнай радасці ад гэтых дзён. Умець чакаць святаў — гэта самая вялікая таямніца і праўда, якую паўтарала яна ўнукам. А пост — гэта не клопат пра тое, што ўваходзіць у рот, але пра тое, што з яго выходзіць. І мела яна рацыю. Як жа зараз справа маецца з умоўным тэрмінам посту ў Праваслаўнай царкве? Аказваецца, што калі ў нас святары на Беласточчыне заклікаюць трымацца посту ў час каталіцкіх свят і навагодніх баляў і цярпліва чакаць Ражджаства паводле „самага справядлівага календара", то ўжо за Віслай абавязвае другое вымярэнне праваслаўнага часу і грэху. Там, аказваецца, святкуюць па-новаму, па-каталіцку, як у нас кажуць. То хто з нас грэшны ў гэтай справе: я ў Беластоку ці мой сябра ў Варшаве? Кожны тыдзень молімся ў храмах за адну і непадзельную праваслаўную веру, а ў поглядах на гэтую ж справу няма адной пазіцыі ў Свяцейшага Сінода. У мяне многа знаёмых звязаных з царкоўнымі коламі, якія з палёгкай едуць з Беласточчыны ў глыб Польшчы загуляць на пераломе снежня да знаёмых — зразумела, таксама праваслаўных. Рэлігійны рэлятывізм ці няўмеласць прыняць рашэнне наконт аднаго тэрміну святаў абавязваючага ўсіх вернікаў? Чаму ў нікога няма сумненняў наконт святкавання Пасхі паводле старога стылю?

І на канец яшчэ адна справа, якая ўпісалася ўжо ў святочны краявід. Ужо на першы дзень Ражджаства на вёсках, асабліва ў Гайнаўскім і Бельскім паветах з'яўляюцца групы дарослых калядоўшчыкаў, якія калядуюць на разбудову і пабудову новых храмаў. Прыязджаюць па грошы ў беларускія вёскі ўжо не толькі каляднікі з Падляшскага ваяводства, але і з глыбі Польшчы. Згодна з прынцыпам, што народ заўсёды мусіць быць з царквой, аддаюць нашыя дзядулі і бацькі апошнія грошы са сваіх мізэрных пенсій (гэта не дзеці-калядоўшчыкі, якім можна даць абы-што, і яны і так будуць задаволены) на хвалу і славу... праваслаўным палякам. У час святочнай рэфлексіі ўзнікае такое вось пытанне: калі на нас, як на беларусах Беласточчыны, абапіраюцца ў фінансавай сферы царкоўныя структуры ў Польшчы, то якія прымаюцца Царквой меры па падтрымцы і развіццю беларускасці сваіх старэйшых ці маладзейшых прыхаджан? Што перашкаджае таму, каб навучанне рэлігіі весці на беларускай мове? Аднак само духавенства і катэхеты ў пераважнай большасці карыстаюцца толькі пальшчызнай. Прыклад вернікам ідзе ад духоўных бацькоў. Не чую я з боку святароў заклікаў да народа, каб не цураўся свайго пісанага слова ў выглядзе „Нівы" ці „Часопіса". Не гавару ўжо пра падпіску ў прыходах. Наадварот, калі гаворыцца пра беларускае, то зазвычай адмоўна. А хачу толькі нагадаць, што амаль 50 тысяч людзей на Падляшшы палічыла сябе беларусамі ў час перапісу насельніцтва. І ім належыцца пашана і павага з боку Царквы для культурна-асветна-грамадскіх імкненняў нашай меншасці. Інакш будаваныя цэрквы стануць пустымі ў наступных пакаленнях, праваслаўныя палякі адыдуць у касцёлы, а толькі жменькі беларусаў будуць трываць пры роднай мове і наведваць збудаваныя продкамі храмы. І заспяваюць калядкі, так як было на гэтай зямлі ад стагоддзяў.

Яўген Вапа

Вачыма паляка

Цана знявагі

Беластоцкі суд даказаў палякам, што можна сабе дазволіць на знявагу іншага народа. Справа толькі ў цане. Тутэйшае правасуддзе знявагу яўрэйскага народа расцаніла на каля 350 злотых ад чалавека. Вось на лаве падсудных засела ў апошні час двух маладых мужчын, якія ў верасні 2002 года ў Падляшскім музеі сарганізавалі „задыму" ў час сустрэчы з паслом Ізраіля ў Польшчы Шэвахам Вэйсам. Увайшлі яны ў Ратушу са свістамі ды транспарантамі „Stop żydowskim interesom", „Ambasador morderców". Усіх разам — каля дзесяцёх маладзёнаў. Суд заняўся справай *z urzędu*. Што цікава, галоўны закід, па маёй ацэнцы, знявагі яўрэйскага народа, быў прадстаўлены толькі тром асобам, бо толькі столькі іх удалося распазнаць, хоць уся сутычка (тых, хто ўварваўся ў сені музея) была запісана камерай Тэлебачання Беласток і фотарэпарцёрамі мясцовых газет. Пракурор Войцех Міхальчук патрабаваў пакарання зняволеннем, бо, як пазней тлумачыўся, пакаранне штрафам не знеахвоціць віноўнікаў да падобных дзеянняў. Аднак, суд узяў пад увагу м.інш. выказванне пасла Вэйса, які пасля здарэння сцвердзіў (несумненна, дыпламатычна), што такія сітуацыі — не навіна. Суд, аднак, не адчуў дыпламатычнага тону становішча пасла і яго стрыманасці, якая мела, мабыць, прадухіліць распальванне канфліктных і нацыяналістычных эмоцый. У выніку таго вынесены быў прыгавор на паўтары тысячы і дзве тысячы злотых штрафу. Калі лічыць, што віноўнікаў, хоць таямніча неідэнтыфікаваных, было дзесяцёх, выходзіць на тое, што калі салідарна і роўна прысуджаных успамогуць усе ўдзельнікі „задымы", дык яны выкладуць з кішэняў па 350 злотых. А калі хтосьці яшчэ і дакладзецца, напрыклад, з немалой у Беластоку групы ксенафобаў і нацыяналістаў? Вядома, мае калькуляцыі не перакладваюцца на логіку органаў правасуддзя, які карае кожнага індывідуальна, у залежнасці ад роду віноўнасці, яе вагі і акалічнасці. Тым не менш, беластоцкі суд рашыў, што знявага іншага народа — вартая грашам. Не ўсчаў, аднак, акрэсленых законам, дзеянняў накіраваных на перавыхаванне, рэсацыялізацыю асуджаных, усё ж, маладых людзей. Калі б я быў праваахоўным ці судовым органам (не толькі пракуратурай, судом, але і паліцыяй), непасрэдна заангажаваным у здарэнне ў Музеі, загадаў бы, напрыклад, вярнуць да парадку беластоцкі жыдоўскі могільнік, у межах, вядома, якія не будуць парушаць рэлігійных пачуццяў яўрэяў. Дарэчы, падобных грамадскіх пакаранняў за зняважанне імі народа было б больш. Хапіла б параіцца ў непасрэдна зняважанага — пасла Вэйса. Але, як казала мая бабуля: „Co wolno wojewodzie, to nie tobie, smrodzie!" Я магу, вось, паразважаць сабе аб гэтым у газетным фельетоне, скажам, у беларускай „Ніве".

Ага, цікава, колькі каштавала б знявага нейкай групай палякаў беларускага народа, беларускай меншасці ў Польшчы. Менш, больш, столькі ж?

Амаль у той самы час, калі прагучаў прысуд (яшчэ неправамоцны), беластоцкая правіца адклікала праваслаўнага раднага Марка Масальскага з клуба Форум меншасцей Падляшша (у выбарах — са спіска СЛД) з пасады віцэ-старшыні Гарадской рады. Ані самаўрадаўцы з прапрэзідэнцкага Беластоцкага паразумення правіцы, ані Лігі польскіх сем'яў не скрывалі, што гэта — рэванш за адкліканне кааліцыяй СЛД — ПСЛ — Падляшская народная ініцыятыва (былая „Самаабарона") з функцыі віцэ-старшыні падляшскага сеймікa Славаміра Згжывы (PO-PiS). Каб было смяшней, заява Права і Справядлівасці (якое ўваходзіць у Паразуменне беластоцкай правіцы) за адкліканне Марка Масальскага, ахоплівала таксама адмяненне ад функцыі віцэ-старшыні Кшыштафа Біля-Ярузельскага з СЛД. Абодва яны мелі быццам бы выкарыстоўваць свае пасады для палітычных гульняў. Дарэчы, такі ж самы аргумент прагучаў у заяве левай кааліцыі ў адносінах да Славаміра Згжывы. У Гарадской радзе кончылася гэта тым, што пасаду захаваў Біль-Ярузельскі, а Марэк Масальскі яе страціў.

На старонках „Кур'ера паранага" паказалася думка, якая гучыць малаверагодна, непасрэднага падпісанта заявы адсунуць абодвух віцэ-старшыняў, Яна Дабжынскага: „Nie miałem pojęcia, że pan Masalski reprezentuje środowsko prawosławnych. Nie miałem pojęcia, że jest związany z mniejszością, w czasie wyborów przecież startował z listy SLD".

Красамоўны загаловак паявіўся ў каментары гэтай газеты: „Lepszy czerwony, niż prawosławny". Лепш не скажаш. Хацелася б толькі спытацца: праваслаўны варты больш, менш, ці столькі ж сама, што і чырвоны для гульняў беластоцкай правіцы? Левага боку, дарэчы, таксама!

Мацей Халадоўскі

Сусед твой — вораг твой?

Аднойчы мне ў рукі трапіў замежны часопіс з рэкламай усялякіх узбраенняў: ад дамскіх пісталетаў да танкаў „Леапард-2". Там былі акуратненька распісаны ўсе параметры і тэхнічныя характарыстыкі зброі, рэквізіты фірмаў-вытворцаў і, натуральна, кошты. Прычым, побач з каляровымі здымкамі, змяшчаліся не менш цікавыя тэксты. Гэткія міні-запрашэнні да набыцця смерцяносных „забавак". Запомнілася чамусьці рэклама мінамёта: „Гэты мінамёт — проста цуд! Найлепшы сродак для вырашэння спрэчак за зямлю на прысядзібных участках!"...

Можа і добра, што на Беларусі адкрыта і легальна не прадаюць зброю. Не цяжка ўявіць, як нашы дачнікі вырашалі б з дапамогай мінамётаў побытавыя спрэчкі на сваіх задрыпаных „фазэндах". Адразу б развеяўся міф пра забітасць, ціхмянасць і талерантнасць беларусаў. Нашы людзі таксама ласыя да зброі. Інакш бы міліцыя не абвяшчала розных там „тыдняў добраахвотнай здачы зброі". А каб народ меў магчымасць купляць пісталеты і аўтаматычныя стрэльбы ў крамах, хай сабе і з рознымі паперкавымі фармальнасцямі? Усё — быў бы поўны капут! Сусед бы пайшоў на суседа! Вось табе і рахманыя, добразычлівыя людзі — нашы землякі з ціхага балота, дзе нешта водзіцца...

Варожасць паміж суседзямі — старая байка без канца і краю. Яна канцэнтруе ў сабе ўсе людскія заганы. Магчыма, у шматпавярховых цесных шпакоўнях, дзе суседзі часта нават не ведаюць адзін аднаго ў твар, і няма падстаў да зайздрасці і помсты. Кожны сядзіць у сваёй клетцы шчаслівы і думае: „Як добра, што я ўцёк з калгаснай вёскі!" Натуральна, за бетоннымі сценамі яго ніхто не бачыць, ніхто не ведае і ведаць не хоча. А ў вёсцы кожны быў навідавоку і з'яўляўся прадметам абмеркавання. Вось гэтае „абмеркаванне", прасцей кажучы, мыццё костак, і было падставай да варожасці. А калі ўлічыць яшчэ прыватнаўласніцкую жылку ды ўжыванне самагону? Тады ой-ёй-ёй!

Нешта падобнае перанеслася і ў нашы часы, калі пасля краху савецкай усеагульнасці ў людзях з неверагоднай сілай зноў зайгралі прыватнаўласніцкія інстынкты. І ў канфліктных сітуацыях усё часцей гучыць не звычайная мацерная лаянка, а жаданне расправіцца з супернікам з дапамогай зброі. Вось і мая суседка (жывем у прыватным сектары) аніяк не можа развітацца са сваім вясковым мінулым і выганяе ў цёплы перыяд на гарадскую вуліцу (!) курэй, каб пасвіліся. (Хай бы паспрабавала іх пасвіць ля аблвыканкама). Ёй напляваць, што іншыя гаспадары-суседзі накуплялі за долары газоннай травы і пасадзілі кветкі, якія куры з задавальненнем дзяўбуць. Больш за тое, гэтыя куры лезуць у чужыя агароды і корпаюцца там колькі заўгодна. Дык вось, калі гэтых курэй нехта з трэскам праганяе са сваіх сотак, гаспадыня крыўдліва заяўляе: „Няма ў мяне на вас таго маленькага аўтамаціка, што бачыла ў целявізары!"

Другога суседа маладыя гаспадары пасля, як ён выканаў для іх пэўную рамонтна-будаўнічую працу, напаілі да ўсрачкі, а калі ён, нямоглы, зваліўся пад плот, — прылюдна абасцалі. Крыху ацверазеўшы пад гэтым „халодным душам", ён прамовіў: „Каб быў у мяне пісталет, я б вас, падлы, застрэліў!"

Такая вось, амаль галівудская, у нашым грамадстве нянавісць а-ля „піф-паф". Прага забіваць з дапамогай зброі, якую бачылі ў кіно. Праўда, паводле паведамленняў крымінальнай хронікі, народ карыстаецца збольшага традыцыйнымі сродкамі расправы — кухоннымі нажамі і сякерамі. Бо мінамёты пакуль недасяжныя...

Юры Гумянюк

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Маладыя прадпрымальнікі. Злева: Марта Малішэўская, Сільвія Залеўская, настаўніца Яўгенія Крук, Міхал Крук, Юстына Грыгарук, Магда Сянько, Іаланта Рута, Наталля Франкоўская і знізу Пётр Якубоўскі

Маладыя прадпрымальнікі

У II Агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім з 1 лістапада пачала дзейнічаць Акцыянерная суполка „Экстрэмальныя працы", якую заснавалі белліцэісты.

Адкрыць прадпрымальніцкую дзейнасць запрапанавала настаўніца Яўгенія Крук, якая вядзе прадмет падставы прадпрымальніцтва. Вучыцца гэтай дзейнасці ліцэісты рашыліся ў рамках пазаўрочнага гуртка, згодна з праграмай „Маладзёжнае міні-прадпрыемства", зацверджанай Міністэрствам нацыянальнай адукацыі і спорту. 15 вучняў з другіх і чацвёртых класаў зрабілі складчыну па 10 злотых, якая стала акцыянерным капіталам суполкі. Галоўны дырэктар прадпрыемства Пётр Якубоўскі падпісаў дамовы з намеснікам дырэктара Андрэем Сцепанюком на арэнду ў школьным будынку памяшкання для вытворчай дзейнасці і плошчы для продажы прадуктаў. Вучні прааналізавалі школьны рынак і пасля выканання бізнесплана пачалі вытворчасць бранзалетаў. Спачатку прадавалі іх у сваёй школе, а пасля ўвайшлі на рынак Комплексу школ з дадатковым навучаннем беларускай мовы ў Бельску-Падляшскім. Каб распачаць продаж сваіх прадуктаў у суседняй школе, вучні вялі размовы з дырэктарам „тройкі" Васілём Ляшчынскім і падпісалі з ім дамову.

— Перш за ўсё хочам навучыцца як засноўваць і весці сапраўднае прадпрыемства. Дзейнічаем згодна з польскім законам, якога павінны трымацца ўсе прадпрыемствы. Займаемся бухгалтэрыяй і лічым колькі сродкаў трэба адвесці ў казначэйскую палату. Рашыліся ўвесь свой даход адводзіць у бацькоўскі камітэт. За гэтыя грошы будзем маглі купіць нешта ў школу або арганізаваць экскурсію, — кажа дырэктар Пётр Якубоўскі. — Напэўна працуючы ў прадпрыемстве больш навучымся, чым у час тэарэтычных заняткаў. Маем нагоду зразумець законы рынкавай эканомікі, вучымся займацца фінансамі, працаваць у групе і кіраваць людзьмі. Пасля працы ў школьнай суполцы атрымаем салідныя фундаменты для стварэння ўласнага прадпрыемства.

Каб магчы выконваць наручныя бранзалеткі, вучні купілі каляровыя ніткі і сабралі пластмасавыя бутэлькі. Рашыліся на продаж у „тройцы", бо вучні падставовай школы больш зацікаўленыя каляровымі прадуктамі. Зараз амаль вярнуліся сродкі, выдаткаваныя на сыравіну і таму сталі думаць як пашырыць сваю дзейнасць. Хочуць звярнуцца да дырэкцыі школы за канцэсіяй на фатаграфаванне. Паводле вучняў ёсць шанц на поспех, бо ў гарадскіх фатографаў няма дазволу на выконванне здымкаў у школе. Калі будуць большыя сродкі, хочуць заказваць сшыткі з надрукаванымі фатаграфіямі настаўнікаў (калі тыя дадуць згоду). Бранзалеткі застануцца пастаянным прадуктам, які будуць рабіць на заказ. У суполцы ўсе вучні займаюцца прадукцыяй і адначасна з'яўляюцца дырэктарамі ў фінансавым, арганізацыйным і гандлёвым аддзяленнях.

— Спачатку моладзі трудна было прывыкнуць да сістэматычнай работы. Прапанова прадукавання бранзалетаў выйшла ад вучняў і гэта самае важнае, — гаворыць апякун вучнёўскага гуртка, настаўніца Яўгенія Крук.

— Гэта суперідэя, бо маладыя людзі на практыцы вучацца прадпрымальніцкай дзейнасці. Цешуся, што ліцэісты рашыліся ў такі спосаб праводзіць вольны час. Маю надзею, што такая дзейнасць стане ў нашай школе пастаяннай і ў наступных гадах вучні будуць займацца прадпрымальніцтвам, — гаворыць віцэ-дырэктар Андрэй Сцепанюк.

Аляксей МАРОЗ

Планы Беларускага асветнага таварыства

Беларускае асветнае таварыства паўстала ў Беластоку ў 1999 годзе. Яго першым старшынёю быў Антон Міранові́ч. Стараннем БАТ у 1999-2002 гадах у Падставовай школе № 11 па вул. Палескай вялося навучанне беларускай мовы, а разам з Цэнтрам праваслаўнай культуры ў 2000 г. арганізаваліся канікулярныя заняткі для дзяцей, якія наведвалі ўрокі роднай мовы.

2 красавіка 2003 г. адбыўся агульны сход членаў БАТ (налічвае яно больш за 30 сяброў), які выбраў новае праўленне і ўнёс дапаўненні ў статут. Старшынёю БАТ стаў Пятро Хомік, а яго намеснікамі — Пятро Юшчук і Міхал Стэльмашук. Членамі праўлення з'яўляюцца Галіна Сурыновіч (сакратар), Людміла Утрутка (скарбнік), Веслаў Іванюк і Дарыюш Малашэўскі. Дапоўнены статут зарэгістраваны быў у судзе 2 снежня 2003 г.

Мэтамі дзейнасці БАТ з'яўляюцца, між іншым, падтрымка навучання беларускай мовы, прапагандаванне традыцыі, культуры, асветы і гісторыі беларускай нацыянальнай меншасці ў Польшчы, ахова беларускай культурнай спадчыны. Статут БАТ прадугледжвае магчымасць стварання садкоў, школ усіх узроўняў, асветна-выхаваўчых, асветна-апякунскіх і культурных устаноў, арганізацый па падрыхтоўцы і ўдасканальванні настаўнікаў. БАТ можа арганізаваць навучанне беларускай мовы, культурныя мерапрыемствы, конкурсы і адпачынак для дзяцей і моладзі. Статут БАТ дазваляе таксама вядзенне выдавецкай дзейнасці ды арганізаванне лекцый, семінараў і канферэнцый.

У планах на 2004 г. БАТ ужо намеціла на май канферэнцыю „Праваслаўныя выдавецтвы ў Рэчы Паспалітай", а на восень — выхад кнігі аб праваслаўнай культуры ў той жа РП.

А 13 снежня мінулага года ўправа БАТ, супольна з Хрысціянска-дэмакратычным аб'яднаннем, выступіла суарганізатарам сустрэчы з вядомымі палітыкамі — сенатарам Збігневам Рамашэўскім і прафесарам Стэфанам Несялоўскім. Гэтае мерапрыемства — доказ таму, што два розныя асяроддзі могуць з сабою супрацоўнічаць. Затым 17 снежня кіраўніцтва БАТ сустрэлася з лідэрамі беларускіх суполак дзеля абмеркавання супольных дзеянняў.

Беларускае асветнае таварыства выказала намер далучыцца да Беларускага саюза ў Рэчы Паспалітай.

Віталь ЛУБА

Гайнаўка

Сустрэча дзеячаў ЛЗС

11 снежня ў Гайнаўскім доме культуры (ГДК) адбылося падсумаванне гадавой дзейнасці ЛЗС (Народных спартыўных калектываў) у Гайнаўскім павеце. Сустрэчу вёў старшыня Павятовага таварыства ЛЗС і адначасова намеснік старасты Гайнаўскага павета Ежы Сірак. Прыбыў на сустрэчу старшыня Ваяводскага праўлення ЛЗС Ян Залеўскі з Беластока. Справаздачу зрабіў сакратар ПТ ЛЗС і адначасова дырэктар ГДК Андрэй Скепка.

У 2003 годзе на Гайнаўшчыне адбыліся шматлікія (было іх каля 40) масавыя гмінныя, павятовыя і міжпавятовыя спартыўныя і адпачынкавыя мерапрыемствы. Найчасцей арганізавалі іх у Гайнаўцы, Нарве, Нараўцы, Чаромсе, Белавежы, Дубічах-Царкоўных, Свінароях каля Нараўкі і Старым Ляўкове. Найбольш папулярнымі былі наступныя віды спорту: футбол, гандбол, тэніс, бегі, пляжны валейбол. Пераможцы, як правіла, удзельнічалі ў ваяводскіх спаборніцтвах. Перш-наперш бегуны з Гайнаўшчыны ўдзельнічалі ў ваяводскіх спаборніцтвах, якія найчасцей адбываюцца ў лесе на беластоцкіх Петрашах.

Зараз на Гайнаўшчыне каардынатарам спартыўных спаборніцтваў каманд ЛЗС з'яўляецца Андрэй Пляскавіч з Нарвы. Ён з Андрэем Скепкам арганізавалі таксама шмат вучнёўскіх клубаў ЛЗС у вёсках. Школьнікі ў рамках клубаў атрымалі бясплатна ад беластоцкіх ваяводскіх улад ЛЗС спартыўныя прылады, між іншым, сталы для тэніса, футбольныя і гандбольныя мячы, казлы і скрыні.

Падчас сустрэчы дзеячаў ЛЗС з Гайнаўшчыны выбралі дэлегатаў на Ваяводскі з'езд ЛЗС, які адбудзецца ў лютым 2004 года ў Беластоку. У ім будуць удзельнічаць Ежы Сірак, Андрэй Скепка, Андрэй Пляскавіч і Войцех Гутоўскі.

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Адгалоскі

У „Ніве" н-р 47 ад 23 лістапада 2003 г. прачытаў я артыкул Уладзіміра Сідарука „Герой ці злачынца", у якім аўтар хаця коратка, але трапна піша аб дакументальным фільме Агнешкі Арнольд „Bohater". На маю думку, Рамуальд Райс „Буры", быў, ёсць і будзе ва ўсёй усходняй Беласточчыне, ад Сувалкаў па Бельск-Падляшскі, у народзе, звацца злачынцам. Ягоныя жаўнеры палілі пераважна беларускія вёскі, забівалі нявінных людзей толькі за тое, што яны былі беларусамі. Колькі яшчэ цяпер сем'яў не ведае, дзе знаходзяцца магілы іх блізкіх, расстраляных атрадам „Бурага", каб на магіле паставіць хаця б бярозавы крыж, ды каб святар хоць разок памаліўся.

Другі артыкул „Памяць народа таксама ў трагічным мінулым" аўтарства Яўгена Вапы змешчаны ў „Ніве" н-р 48 ад 30 лістапада 2003 г. дакладна даказвае дзеянні атрада „Бурага", па якім відаць, што Рамуальд Райс павінен залічацца да злачынцаў. Сказаць трэба тут, што пракурор Інстытута нацыянальнай памяці Дар'юш Альшэўскі пацвярджае злачынствы „Бурага" *na tle narodowościowym*. Не варта астаўляць белых плям у нашай гісторыі, хаця яны і прыкрыя для ўлады.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Шанц для беспрацоўных

Больш за паўтары тысячы беспрацоўных і будучых пад пагрозай беспрацоўя скарыстае на Падляшшы з бясплатных абучэнняў і прафесійных пара**д.** Магчыма гэта дзякуючы еўрасаюзным грошам (праграма PHARE 2001). Прадбачваецца таксама абучэнне тысячы працаўнікоў і ўласнікаў малых і сярэдніх фірмаў, якія дазваляюць утрымаць месцы працы і павышэнне прафесійных кваліфікацый. Апроч таго, 120 прадстаўнікоў прафесійных школ і наглядальнікаў над асветай пазнаёміцца з магчымасцямі змены абучальнай прапановы, так, каб яна была дастасаваная да патрэб рынку. Школы, якія прадставяць найлепшыя праекты, могуць разлічваць на ўзнагароды — камп'ютэрнае абсталяванне вартае агулам 170 тысяч еўра.

У рамках усяго праекта ў рэгіёне дакладна 1 256 асоб зможа прайсці прафесійнае абучэнне, у прафесіях, якіх шукаюць на рынку працы, а 314 асоб прыме ўдзел у курсах дзеля адкрыцця ўласнай гаспадарчай дзейнасці.

Набор удзельнікаў да праекта праводзіцца ў павятовых установах па працаўладкаванні. Тут можна атрымаць фармуляры заяў, якія пасля запаўнення хопіць укінуць у спецыяльныя урны. Да кожнай асобы з'явіцца прафесійны дарадчык. Дапаможа ён выбраць абучэнне і паінфармуе аб тэрміне.

(холм)

Зорка

старонка для дзяцей

Вершы Віктара Шведа

Ці дзеці гэта ўзнагарода?

Спытаць матулю ёсць нагода:
— Ці дзеці гэта ўзнагарода?
А мама падліслівіць хоча:
— Гран-пры — мой дарагі сыночак.

— Па-мойму, — адазваўся Жэня, —
Узнагарода суцяшэння.
Татка, калі сваяк прыехаў,
Сказаў: — А вось мая пацеха.

Матуля быццам куля

Сказала Гануля:
— Скардзіцца татка,
Што нашая матка
Найгоршая куля.

Упадае ў вока,
Сэрца крывавіць,
Кішэню дзіравіць,
Выходзіць бокам.

Ларыса Геніюш

Зіма

Зіма сярдзітая з марозам,
З завеяй белаю прыйшла,
Дыван прыгожанькі, сняжысты
Да нас з паўночы прынясла.
З-за хмарак выпаўз ціха месяц,
Збірае зоркі ў карагод.
І заблішчэлі, як брыльянты,
На дрэвах іней, снег і лёд.
Ці то ад іх, ці то ад зорак,
Ды відна стала ўсё, як у дзень,
А шэранькія хаткі вёскі
На белым снезе, нібы цень.

У гасцях у бабулі Мані

На свята Каляд многія з вас наведаюць радню — у вёсках, у малых і вялікіх гарадах. Зараз усюды святкуюць аднолькава. Усе садзяцца ля тэлевізара і глядзяць у экран. Мы хочам заахвоціць вас да іншага адпачынку.

Аднойчы мы прыслухаліся як гутараць бабуля і ўнучка.

— Бабцю, а колі до мэне прыедэш? — пытае на развітанне Дарыя. Дарка Вапа ад'язджае ў Беласток. Заўтра пойдзе ў беларускі садок.

— А, можэ діэд нэхай до тэбэ прыедэ? — кажа ўнучцы бабуля Марыся. — Хочэш коб хто прыехаў до тэбэ: я — чы діэд?

— І ты, і діэдко, — кажа разумнічка.

На час прыезду ўнучкі пані Марыся Андраюк заслала на стол белы абрус у каляровыя кветкі. Вышывала яго сваімі рукамі. Ці марыла тады пра ўнучку, з якой будуць размаўляць як у сапраўднай сям'і — на роднай мове!

Зорка

Фота ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Марыя Андраюк з Бельска-Падляшскага з унучкай Дарыяй

Дарагая „Зорка"!

Мяне завуць Дарота Цімашук. Я хачу расказаць пра вёску Дубіны, у якой знаходзіцца наша школа. Вёска Дубіны распаложаная каля Гайнаўкі. Гэта вялікая вёска. У ёй больш за дзвесце хат. Ёсць хаты драўляныя і мураваныя. У Дубінах таксама школа, царква, клуб, крамы, дрэваапрацоўчыя майстэрні, могілкі. Праз вёску пралягае шаша Гайнаўка — Беласток. Наша вёска — прыгожая. Летам у ёй многа зелені. Перад хатамі агародчыкі, людзі часта адпачываюць на лавачках. Непадалёк нашай вёскі распасціраецца Белавежская пушча.

Твая чытачка Дарота

Як вымерлі яцвягі

У суботу Рута і Рая пайшлі ў лес за грыбамі. Заўсёды прыносілі ў дом поўныя кошыкі. Аднак гэтым разам было інакш. А чаму?

Паслухайце.

Калі сёстры канчалі збіраць грыбы, ззаду нешта грукнула. Гэта вывярнулася дрэва.

— Ах! — крыкнула напалоханая Рая. — Уцякайма, тут дзеецца нешта страшнае.

Рута хацела адказаць сястры, але ў яе адняло мову. Перад дзяўчынкай зваліліся чарговыя два дрэвы.

Сёстры кінуліся ўцякаць. Калі яны беглі, ішоў дождж і вываварочваліся чарговыя елкі і дубы. Адным словам — жах! Яны нават не заўважылі, як раздзяліліся.

— Рута! Рута! — гукала Рая.

— Рая! Рая! — крычала Рута.

Рута пачала плакаць. Яна была малая і не ведала дарогі дахаты. На шчасце, яна была мудрай дзяўчынкай і смела бегла ўперад. Пад нагамі шалясцела жоўтая трава. Над галавой танчылі чырвоныя і карычневыя лісткі. Заходзіла сонца. Руце пашчасціла вярнуцца дахаты.

— А дзе ж сястрыца? — здзівіліся бацькі.

— Не ведаю! — расплакалася дзяўчынка.

Усе падумалі пра найгоршае. Але пазваніў тэлефон і там нехта сказаў, што Рая жыве. Яе злавіў злы чараўнік з Чортавага Бору.

Сям'я рушыла ў лес шукаць дзяўчынку.

* * *

Рая сядзела ў бруднай клетцы і думала, ці яшчэ нешта здарыцца. Яе думкі перабіў чараўнік, які адчыніў дзверцы клеткі:

— Выходзь, малая! — крыкнуў на ўвесь голас і засмяяўся: — Прадам цябе яцвягам!

— Не, не! — пачала пратэставаць Рая.

Але гэта не цікавіла чараўніка. Ён загадаў выйсці на панадворак. Рая адчыніла шырокія дзверы і пабачыла снег. Там стаялі яцвягі.

— Гэта тая? — спытаў адзін.

— Тая, — адказаў чараўнік.

— Колькі хочаш?

— Пяцьсот еўра-рублёў.

— А ўмее яна мыць лыжкі?

— Умее.

— То бярэм, — яцвяг даў чараўніку мяшочак з еўравалютай.

— Дзякую, — крыва ўсміхнуўся чараўнік і вярнуўся дахаты.

* * *

Уся сям'я ішла лугам, а пасля борам. Раптам каля іх праімчалі белыя сані. Яны азірнуліся і ўбачылі Дзеда Мароза.

— А вы куды? — пацікавіўся Мароз.

— Дачка ў нас прапала. Ужо тры

Польска-беларуская крыжаванка № 1

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы (з наклееным кантрольным талонам) на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Podstawa	Kolega	Poród	▼	Wanna	▼	Halina
▶	▼			▼		╳
Jabłoń		Dal	▶			
▶						As
Mapa		╳	╳		╳	▼
▶					╳	

Адказ на крыжаванку н-р 49: Пасаг, мур, ара, ікс, шлак, тэатр, гай, полк, Ліда, кіт, Арыён, Яга, Анна. Мір, пук, пірог, арс, год, талака, шэйк, Іра, гала, тын, рата, ён, акр, сцэна.

Узнагароды — магнітафонныя касеты з беларускімі казкамі і песнямі — выйгралі: **Агнешка Ляўчук** з Новага Корніна, **Паўліна Мялешка** і **Агата Балтрамюк** з Дубін, **Марта Валосік** з Бельска-Падляшскага, **Віялета Плашкевіч** і **Анна Свентухоўская** з Нарвы, **Анна Баравік** з Елянкі. Віншуем!

Спонсар узнагарод — **Беларускі саюз у Польшчы**.

Дубіны ў Пружанах

Вучні Гімназіі ў Дубінах хочуць падзяліцца сваімі ўражаннямі ад паездкі ў Пружаны, што ў Беларусі. Адбылася яна 2 лістапада 2003 года ў рамках абмену моладдзю паміж суседнімі дзяржавамі Польшчай і Беларуссю.

У мінулым годзе, на ёлку ў нашай школе мы прымалі каля дваццаці вучняў старэйшых класаў пятай Пружанскай гімназіі.

У гэтым навучальным годзе па іх запрашэнні мы паехалі туды на Свята гімназіста. Вучні іхняй гімназіі падрыхтавалі многа конкурсаў, выступленняў з песнямі, танцамі, гумарыстычнымі сцэнкамі. У гэты дзень чацвёртакласнікаў прымалі ў рады гімназістаў. Усё гэта выглядала вельмі дастойна і ўрачыста — быў торт са свечкамі (*на здымку побач*), а ўсе чацвёртакласнікі атрымалі ганаровае званне гімназіста.

Свята школы працягвалася з самай раніцы да позняга вечара. Нам усё гэта вельмі падабалася. Мы многаму навучыліся ад іх, і, думаем, што ў будучыні гэтыя веды выкарыстаем пры арганізаванні свята ў нашай школе.

Пружанскія вучні і настаўнікі вельмі сардэчна нас віталі, паказвалі нам сваю школу, правялі таксама экскурсію па горадзе, які аказаўся вельмі чысценькім і каляровым.

Абедалі і вячэралі мы ў вельмі шыкарным рэстаране. А ўвечары пабывалі на дыскатэцы разам з моладдзю гэтай школы. Гэтая паездка надоўга застанецца ў нашай памяці, таму што мы падружылі з нашымі аднагодкамі, абмяняліся нумарамі тэлефонаў, адрасамі. Думаем, што будзем пісаць, званіць і што гэтая паездка не была апошняй. Мы прывезлі адтуль многа ўражанняў, якімі дзелімся з тымі вучнямі, якім паехаць не пашанцавала.

Экскурсію гэтую сарганізавала нам дырэктар Тамара Крайнік пры дапамозе настаўніц беларускай мовы Валянціны Касцевіч і Ніны Куптэль.

Фінансавую дапамогу пры афармленні віз аказала Павятовае староства ў Гайнаўцы. Гэтую паездку ўзначальваў прадстаўнік гэтай установы Павел Крайнік, які выказаў вялікія здольнасці ў афармленні мноства дакументаў неабходных у часе перасячэння мяжы ў Баброўніках.

Многа здымкаў — яны памятка вучням — зрабілі мы дзякуючы фінансавай падтрымцы Цэнтра грамадзянскай адукацыі Польшча-Беларусь.

Усім, хто дапамог сарганізаваць такую цікавую і карысную сустрэчу, мы вельмі ўдзячны.

Вучні
Публічнай гімназіі ў Дубінах

Легенда пра Бельск

Даўным-даўно ў горадзе Бельску стаялі драўляны замак і царква. Аднойчы над горадам узнялася бура. Нахлынула чорная хмара, бліскалі маланкі, ад якіх загарэўся замак. Жыхары горада беглі тушыць пажар, але замак згарэў. Людзі з навакольных вёсак бачылі пажарышча замка і не здзіўляліся, што ён знік. Не было следу і па вялікай царкве. Людзі пабачыўшы такі вобраз, сталі дзівавацца — што такое магло здарыцца? Пачалі гаварыць, што царква запалася пад зямлю. І цяпер — кажуць старажылы — у ціхую Велікодную ноч чуваць, як б'юць званы пад Замкавай гарой. Хто іх пачуе — споўняцца яго мары.

Маргарыта Красоўская,
VI „ц" кл. бельскай „тройкі"

Разам гуляем і танцуем

14 лістапада 2003 г. у Нараўчанскай гімназіі адбыліся атрасіны першых класаў. Гэта ўжо стала традыцыяй, што імпрэзу рыхтуюць другакласнікі. Адказнымі за сцэнарый і найбольш актыўнымі былі дзяўчаты: Наталля Раманчук, Святлана Дрозд, Наталля Вярбіцкая, Марта Сухадола і Эдыта Хэлмэцкая. Дапамагала ім яшчэ шмат людзей.

Мы, другакласнікі, падрыхтавалі 23 канкурэнцыі. Яны перапляталіся са смешнымі тэкстамі на рускай, беларускай, польскай і гутарковай мовах. Уся гульня абапіралася на жыццё вясковых людзей і іх штодзённую працу. Дзяўчаты апрануліся як сапраўдныя колішнія „вясковыя бабы", а хлопцы — як мужыкі. Са старых шафаў выцягнулі спадніцы, фартухі, валёнкі, фуфайкі і шапкі-вушанкі. Хапіла паглядзець на вядучых, а ўжо можна было пакаціцца ад смеху.

Найбольш вясёлымі былі наступныя канкурэнцыі, у якіх першакласнікаў аблівалі кісялём і пасыпалі пер'ем, кармілі іх сумессю кашы і кісялю, аблівалі вадою і памідорным соусам, кармілі з карыта. Вучні даілі таксама карову, якая давала кіслае малако. Не забыліся мы таксама аб настаўніцах, якія ў хустках і фартухах скрэблі на час бульбу.

Першакласнікі спачатку баяліся атрасінаў і таму мы пыталі ў іх дазволу, ці можна іх запэцкаць. На ўсякі выпадак усе прыйшлі апранутыя ў старую вопратку, а школьную актавую залу забяспечылі цыратай. Пасля ўсіх змаганняў гімназісты пайшлі на дыскатэку, але перад гэтым — прывялі школу ў парадак.

Думаю, што трэба арганізаваць такія імпрэзы. Даюць яны магчымасць некаторым вучням выказаць сваю актыўнасць, а потым ёсць аб чым пагутарыць і што паўспамінаць.

Эмілія Каральчук,
II „ц" кл. Гімназіі ў Нараўцы

месяцы, як пакінулі мы хату і шукаем яе.

— А можа ў чым вам дапамагчы?

— Калі можаце, — папрасіла нясмела маці. — У вас таксама многа працы.

— А дзе там! — махнуў рукой Дзед Мароз і дадаў: — Садавіцеся хуценька ў сані. Паехалі.

У Чортавым Бары сустрэлі чалавека.

— Ты хто? — спытаў Мароз.

— Юрка Кумант, — зірнуў з-пад ілба незнаёмы, — я выйшаў вам на сустрэчу.

— Як гэта?

— Вы ж... шукаеце малой? — дадаў асцярожна.

Праз момант усе маўчалі.

— Я бачыў, — перабіў маўчанне Юрка, — як чараўнік прадаў яе яцвягам.

Дзед Мароз падзякаваў за вестку і свіснуў на аленяў: — Па-а-ехалі!

— А вы, дзедка, ведаеце, дзе яны жывуць? — прашаптала Рута.

— Чаму не? Жыву ўжо тысячу гадоў.

* * *

Рая сядзела ля вялікага дуба і глядзела, як яцвягі рэзалі на кавалкі ўпаляванага зубра.

— Цікава, навошта я ім тут патрэбная? — думала дзяўчынка.

Тут жа пад'ехалі белыя сані. Рая пачула голас сястры.

— Рутачка! Сястрычка! — адазвалася яна.

Яцвягі кінулі кроіць зубра.

— Вы тут чаго? — запытаў адзін сям'ю ў санях.

— Мы па дачку. Тры месяцы яе шукаем.

— Прэч адсюль! — знерваваўся яцвяг. — Мы яе купілі за „цяжкія" грошы.

— Супакойцеся, панове, — уключыўся ў гутарку Дзед Мароз. — Паслухайце. — Мароз пагладзіў белую бараду. — Аддамо грошы.

— Не, — пакруцілі галовамі яцвягі. — Мы яе палюбілі, за ніякія грошы не аддамо.

— Калі мяне не паслухаеце, — дадаў Мароз, — дык горка пашкадуеце.

Яцвягі не хацелі слухаць Мароза. За гэта ён памяняў іх у лясных звяроў і птушак. А калі зачараваў і звярына паспешліва разбеглася па лесе, з'явіліся крыжакі.

— Хай людзі думаюць, што гэта вы іх знішчылі, — сказаў спакойна Мароз.

— Хай думаюць! — згадзіліся крыжакі.

* * *

У час калі сям'я шукала Раі, вецер разбурыў іх хатку.

— Не бядуйце! — сказаў Мароз. — Дам вам другую хатку. Што скажаце пра лясны двор у Белавежскай пушчы?

Уся сям'я аж ахнула ад захаплення.

— Як жа так? — здзівіліся бацькі.

— А так, — заўсміхаўся Мароз, — гэта за вашу адвагу. Вы зрабілі ўсё, каб адшукаць дачку.

Наталля Кандрацюк-Свярубская
(„Пляткарка"),
V кл. ПШ н-р 4 у Беластоку

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Ірэна Лукша

Бярозкі

Агата і Максім вельмі любілі гаспадарыць. Стараліся як найлепш апрацаваць зямлю і атрымаць добры плён. Пабудавалі гаспадарчыя будынкі і купілі трактар ды машыны. Задумалі купіць камбайн, але хацелі ўпэўніцца, ці хтось з тройкі дарастаючых дзяцей будзе гаспадарыць. Двух сыноў і дачка адмовіліся. Сумна было бацькам пачуць такое, але такі ўжо лёс. Амаль уся моладзь з вёскі выязджала ў горад.

Дзеці пасля заканчэння універсітэтаў асталіся ў горадзе. Бацькі рабілі ім вяселлі і дапамагалі ладзіць хрысціны. Часта вазілі хлеб і мяса. Дзеці рэдка прыязджалі памагаць ім.

Сужонства рашыла пасадзіць за гумном на палове гектара бярозкі. Яны вельмі любілі гэтыя дрэвы. Называлі іх сястрыцамі.

— Чаму вы змарнавалі столькі зямлі? — пыталі суседзі. — Тут магло б збожжа расці. Што з гэтых бярозак? Якая з іх карысць?

— Нам падабаюцца бярозкі, — адказвалі суседзям, — яны заступяць нам дзяцей і ўнукаў. Бярозкі, быццам сястрычкі, блізкія нам.

— Яны, напэўна, здзяцінелі, — смяяліся з Агаты і Максіма суседзі. — Бачыў хто, каб дрэва заступіла чалавека! Бярозкі гэта сястрычкі, як можна такое падумаць!

Міналі гады. Гаспадары старэлі і з кожным годам траціллі здароўе, а бярозкі былі штораз вышэйшымі, а іх ствалы таўсцелі.

Сужонства часта хадзіла паміж радамі бярозак і гаварыла да іх, як да людзей.

Зусім неспадзявана памёр Максім. Агата падыходзіла да кожнай бярозкі, абымала яе і, плачучы, гаварыла: „Няма ўжо твайго вернага сябра".

— Звар'яцела жанчына, — гаварылі суседзі, — муж на покуце ляжыць, а яна бярозкі абымае.

Пасля пахавання дзеці хацелі забраць Агату ў горад, але яна адмовілася: — Я тут пражыла сорак гадоў і тут дажыву. Не магу я пакінуць бярозак.

Тры гады пасля смерці мужа Агата сама абрабляла ворнае поле, даглядала кароў, свіней і курэй. Штодзень хадзіла і гаварыла да бярозак. Скардзілася ім на свой нялёгкі ўдавіны лёс.

Калі сіл не хапіла працаваць, жанчына з вялікім плачам аддала зямлю дзяржаве. Цэлымі днямі хадзіла між бярозкамі і галасіла: „Дарагія мае сястрычкі! Што з вамі зробіць новы гаспадар?! Як мне цяжка будзе расставацца з вамі!"

Зямлю ад гміннай управы купіў Ігнат. Гэта быў нядобры чалавек. Аднавяскоўцы не любілі яго, бо насміхаўся з усіх. Усім паўтараў, што не ўмеюць гаспадарыць і сваіх дзяцей павыганялі з вёскі, а яго дзеці засталіся на гаспадарцы.

Пасля сяўбы ўзяўся Ігнат за высечку бярозак. Убачыўшы гэта, Агата прыбегла і пачала прасіць: „Ігнат, змілуйся! Не рубай іх, пакуль я жыву. Няхай растуць..."

— Я тут гаспадар і зраблю, што схачу. Мне іх не трэба. Выдумалі, чорт ведае што. Бярозкі заступяць ім дзяцей і ўнукаў! А цяпер, можа, вам і за мужа будуць? Я іх выкарчую, а вясной пасею авёс.

Жанчына абняла бярозку і загаласіла: „Мае вы сястрычкі! Рана вам падаць ад сякеры злога чалавека! Каб Бог даў яго так вывезлі, як будзе вас вывозіць!"

Ігнат сілай адарваў Агату ад дрэва. Завёў на панадворак і загадаў: „Каб больш твая нага не ступіла на маё поле, бо зарубаю!"

Агата праклінала яго, не магла забыць бярозак.

Ігнат стрымаў слова, выкарчаваў бярозкі. Веснавой сяўбы не дачакаў. Зімою захварэў і пасля тыднёвага побыту ў бальніцы памёр.

— Ёсць нешта на свеце, — гаварылі суседзі, — споўнілася праклянцце Агаты. Вывез ён бярозкі з поля і яго вывезлі на могільнік. Мог пачакаць смерці Агаты. Яшчэ паспеў бы справіцца з бярозкамі.

Агата пасля смерці Ігната пражыла яшчэ пяць гадоў. Штодзённа глядзела на апусцелы кавалак зямлі, якая зарасла пустазеллем. Ігнатавы дзеці баяліся праклянцця і да смерці пенсіянеркі не аралі таго ўчастка зямлі.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

Мікалай Лук'янюк, Ірэна Лукша і Марыя Манаховіч

Марыя Манаховіч

Белавежскія сосны

Сосны белавежскія
цудоўныя красуні,
высокія, узнёслыя
лясныя прыгажуні.

Рдзеюць пянькі гладкія,
быццам медныя блішчаць,
зялёныя іх шапкі
важна ў неба глядзяць.

Шумяць верхавіны дрэў,
дрыжаць яны, ракочуць,
быццам пра сваё жыццё
расказаць нам хочуць.

Хочуць расказаць нам усё:
як раслі, узрасталі,
прапалі слабейшыя,
толькі яны тут жыць сталі.

У Белавежскай пушчы
растуць такія сосны,
што перажылі ў ёй
розныя зімы і вёсны.

Іней

На ўсіх дрэў галінках
серабрыцца іней.
Дробныя галінкі
дрыжаць як асіна.

Усе дрэвы ў белі —
інеем прыбраны.
Стаяць у задуменні
як зачараваны.

Іней, іней, шэрань
хрустальны прыгожы,
праз адзіну ночку
цуды стварыць можаш.

Усюды, чыста, бела,
цішыня царыць.
Толькі пад нагамі
замерзлы снег скрыпіць.

Мікалай Лук'янюк

Сцяна

Нам усходнюю сцяну
Ўсім трэба шанаваці,
Тут жа Ваня пражываў
Жыла і яго маці.

Яны ў гарады пайшлі
Там турбот не знаюць,
Час ад часу на уік-энды
Ў вёску яны прыязджаюць.

Усе панадворкі абраслі
Пустазеллем у пояс,
Няма каму іх абкасіці
І то найгорша доля.

Стрэхі хіляцца ў хлявах,
Так страшна спаглядаці,
Яны жывуць у гарадах
Не могуць разабраці.

Дзверы ў хатах на замках
Д'яблы там гуляюць,
А яны ў кнайпах сядзяць
Ды піва папіваюць.

Вось які цяперка час
Пра зямлю не дбаюць,
Толькі на ягады і грыбы
Улетку прыязджаюць.

Непрафесійнае мастацтва высокага ўзроўню

У X Аглядзе непрафесійнага мастацтва Гайнаўскай зямлі, які арганізаваў Гайнаўскі дом культуры, прынялі ўдзел больш за 30 выканаўцаў. З ліку прапанаваных 130 прац камісія на выстаўку ў галерэі „Гайна" Музея і асяродка беларускай культуры ў Гайнаўцы адабрала больш за 90 найлепшых работ. Выстаўку адкрылі 14 снежня 2003 года дырэктар ГДК Андрэй Скепка і старшыня ўправы Беларускага музея Міраслаў Мордань. Гайнаўскі мастак Віктар Кабац падвёў вынікі конкурсу, адзначаючы высокі ўзровень прац аматараў.

— На выстаўцы паказваюцца працы трох творцаў, якія шмат зрабілі ў мастацтве. Гэта Пётр Гаган, Станіслаў Паскробка і Станіслаў Жывалеўскі. Самы высокі ўзровень прэзентуе Пётр Гаган (*на здымку*) — знакаміты рэаліст. Матывы яго прац моцна спалучаны з нашым асяроддзем. Работы Станіслава Паскробкі цікавыя. Яны спакойныя ў колерах і зроблены на памежжы рэалізму і абстрактнасці. Прадстаўляе ён краявіды, якія не адклікаюцца да канкрэтнага рэальнага свету. Станіслаў Жывалеўскі — мастак-філосаф, які выступае супраць халоднай цывілізацыі. Спасылаючыся на сакральнае мастацтва, кранае ён праблем нашых часоў, — заявіў Віктар Кабац.

Фота АЛЯКСЕЯ МАРОЗА

Згаданыя мастакі атрымалі першыя ўзнагароды. Пётр Гаган на алейных карцінах намаляваў тры царквы — з Супраслі, Кастрамы і Гайнаўкі. Станіслаў Паскробка прадставіў краявіды, якія ўзнікалі пад уздзеяннем эмоцый мастака. Сакральна-індустрыяльныя матывы на алейных работах Станіслава Жывалеўскага атрымалі спрэчныя ацэнкі гайнавян. Не спадабалася выкарыстанне сакральных матываў у свецкай абстаноўцы.

Апрача алейных работ, удзельнікі конкурсу прад'явілі пастэлі, рысункі, графіку, а нават камп'ютэрныя працы. Камісія не прызначыла другіх месцаў, а трэцяя занялі Катажына Галашэвіч за акварэльную работу з краявідам Кракава, Павел Кас'янюк за абстрактную пастэльную працу, Мікола Яноўскі і Генрык Курадчык за алейныя карціны. Трэцюю ўзнагароду за разьбу атрымаў Мечыслаў Дудзін. Абстрактныя работы з карэнняў дрэў прадставіў Уладзімір Мусько, якія камісія ўключыла ў катэгорыю разьбы. Часлаў Проньчык прадставіў інтарсію, якая раней масава развівалася ў горадзе з дрэваапрацоўчай прамысловасцю. Свае малюнкі прадставіў таксама Славамір Кулік, вядомы на Гайнаўшчыне фатограф. Пераможцы конкурсу атрымалі ўзнагароды, а ўсе ўдзельнікі — дыпломы.

Старшыня Таварыства сяброў Гайнаўкі Ядвіга Рудзінская-Патэюк прадставіла ідэю супрацоўніцтва таварыства з домам культуры. Прапанавала яна, каб у галерэі „Гайна" арганізаваліся пастаянныя экспазіцыі, а працаўнік ГДК вёў там пастаянныя мастацкія заняткі з дзяцьмі. Ідэю падтрымаў дырэктар ГДК Андрэй Скепка, які абяцаў наладзіць пастаяннае супрацоўніцтва з Беларускім музеем. Яго старшыня Міраслаў Мордань і дырэктар Ян Карпюк згодны на супрацоўніцтва.

Аляксей Мароз

Праваслаўныя дачыненні Віфлеема

Нараджэнне Хрыста ў Віфлееме прывяло да ўзвышэння гэтага раней невялікага горада ў ранг вялікага культавага і манаскага цэнтра.

Віфлеем распаложаны каля дзесяці кіламетраў на поўдзень ад Іерусаліма. У сённяшні час пражывае там каля 32 тысяч жыхароў, палесцінцаў — мусульман і вернікаў розных адгалінаванняў хрысціянства. Яўрэйская і арабская назвы горада выводзяцца з аднае крыніцы, дзе Віфлеем — „дом хлеба". Гэтакую назву даў мясцовасці патрыярх Аўраам, прарочачы такім чынам, што там народзіцца „Хлеб жыцця" — Ісус Хрыстос: „Я ёсць хлеб жыцця: хто прыходзіць да Мяне не будзе згаладалы, а веруючы ў Мяне не будзе сасмаглы" (Іаан: 6, 35). Таксама прарок Міхей звязвае Віфлеем з прыходам Месіі: „А ты, Віфлеем, хаця малы ў Іудавай зямлі, з цябе выйдзе Той, каторы павінен быць Уладыкам у Ізраілі, і якога паходжанне ад пачатку, ад дзён вечных" (Міхей: 5, 2).

Фота: http://vos.1september.ru/2002/48/3.jpg

Месца Нараджэння Хрыста

Нараджэнне Хрыста здзейснілася ў пячоры каля Віфлеема. У непагадзь пячора служыла прытулкам для пастыраў і іхняй жывёлы. Яна стала месцам асаблівага пакланення ўжо з самага пачатку хрысціянства.

Першыя хрысціяне паставілі над яслямі дом малітвы. У 326 годзе за ахвяраванні імператара Канстанціна Вялікага і ягонай маці Галены пабудавана была вялікая пяцінефавая базіліка, якая вытрымаўшы бурлівыя стагоддзі пажараў, нападаў, грабяжоў і перабудоў, на сённяшні дзень астаецца месцам служэння праваслаўнай Літургіі. Усталяваўся там асаблівы звычай: паломнікі складваюць пальцы так, як робіць гэта блаславяючы святар. У XVI стагоддзі базіліка дастаецца праваслаўным, у 1660 годзе займаюць яе католікі, але ў 1757 годзе пераймаюць яе зноў праваслаўныя, пакідаючы адно левы флігель армянам. Да бакоў базілікі прылягаюць манастыры: праваслаўны, францысканскі і армянскі. Калісь у базіліку вялі тры брамы; сёння дзве з іх замураваныя цалкам, а ў трэцяй пакінуты адно нізкі праход, праз які можна ўвайсці толькі схіліўшыся. Зроблена гэта дзеля прадухілення прафанацыі храма мусульманамі, якія ўязджалі туды на конях з мэтай разбояў і грабяжоў. Інтэр'ер храма захапляе веліччу мастацтва колішніх будаўнікоў.

Алтарная частка ўзвышаецца 60 сантыметраў над узроўнем падлогі, бо непасрэдна пад алтаром знаходзіцца Пячора раждзтва Хрыстова, у якую вядуць дзве крутыя лесвіцы. Вонкавае святло не даходзіць туды і паўцемру асвятляюць 53 алейныя лампады. Месца нараджэння Ісуса пазначана белым мармурам. Евангелле ад Лукі расказвае, што Прасвятая Дзева „спавіла Яго і паклала Яго ў яслі, бо не было ім месца ў гасцінай" (Лк: 2, 7). Тут пакланяліся Ісусу першыя паклоннікі, пастыры закліканыя голасам анёлаў. Капліца ясляў з'яўляецца ўласнацю католікаў.

Выходзячы з Пячоры нараджэння ўверх лесвіцай можна трапіць у падзямельную капліцу, дзе паводле традыцыі знаходзіцца магіла забітых па загадзе Ірада хлопчыкаў узростам да двух гадоў; гэтая капліца належыць праваслаўным. У многіх нішах відаць белыя костачкі дзяцей, якіх праз дзве тысячы гадоў час не крануў у прах.

Ёсць там і іншыя пячоры, напр. Пячора сну Іосіфа (Мт: 2, 13), ад якой можна прайсці да трох капліц: св. Іераніма, св. Яўсевія і святых рымскіх матрон. Капліцы і пабудаваны францысканцамі ў 1882 годзе касцёл св. Кацярыны належаць католікам.

Пад канец лістапада 1996 года, калі ў базіліцы Раждзтва Хрыстова сабраліся тысячы вернікаў, з вачэй Хрыста на старой фрэсцы сталі праліваціа слёзы; першым гэты цуд убачыў грэчаскі манах Афанасій. Твар Хрыста на іконе напоўніўся сумам і болем; многія тлумачаць гэта надыходам неспакойнага часу.

Міхал Мінцэвіч

Аб праваслаўных паляках

У 46 нумары „Нівы" ад 16.XI.2003 г. быў змешчаны вартасны артыкул „Дзве польскія нацыі" аб цяжкім становішчы беларускай меншасці, аб скрыванні значнай часткай грамадзян сваёй няпольскай нацыянальнасці, каб схавацца ад варожасці, нязычлівасці і яшчэ горшых з'яў, якіх нямала бывала на паваротах польскай гісторыі. У апошнім перапісе насельніцтва аж 774,9 тысячы грамадзян наадрэз адказалася назваць сваю нацыянальную прыналежнасць.

Прэса ПНР неталерантнасць палякаў старалася тлумачыць „вынікамі забораў". Слабое гэта тлумачэнне, бо з аналізу гісторыі мы бачым, што перад заборамі, у гады экспансіі на ўсход, палякі былі яшчэ больш неталерантнымі. Народы захопленых усходніх зямель баранілі сваю культуру, веру і існаванне. Асновы Рэчы Паспалітай патраслі паўстанні, якія — па словах выдатнага польскага пісьменніка Г. Сянкевіча (1846-1916) — „zatruły krew pobratymczą" між палякамі і русінамі. Трэба тут дадаць, што пасля апошняй вайны крывавы „Буры" і другія такія злачынцы зноў затрывалі на Беласточчыне „krew pobratymczą". На Беласточчыне ў першыя пасляваенныя гады, па няпоўных даных, замардаваны былі тады 2 782 асобы, а больш 39 тысяч змушаны былі пакінуць сваю зямлю і свае хаты і перасяліцца ў СССР. Гэтых злачынстваў не хочуць асудзіць ні польскія суды, ні ўлады, бо там сядзяць аднадумцы злачынцаў, а нават парадачныя палякі пабойваюцца, прытаіўшыхся зламыснікаў. Усе польскія паўстанні пачыналіся тэрорам супраць усходніх нацыянальных і рэлігійных меншасцей. Было гэта адной з прычын паражэнняў. Толькі апошняе польскае паўстанне 1989 г. адбылося без нагонак на меншасці і кончылася перамогай, ператварыўшыся ў палітычны пераварот. Але ў найбольш баязлівых і найменш таленавітых трасуцца паджылкі і яны пераходзяць у праваслаўных палякаў. Гэта не толькі нехвалебная трусасць, але і вотум недавер'я да парадачнасці польскіх улад і большасці актыўных палякаў. Кожны бачыць, як нават высокія чыноўнікі змянілі сваю шкуру. Разумеецца, гэта не апраўдвае супертрусоў і падхалімаў.

У 1957 г., была другая невялікая рэпатрыяцыя палякаў з СССР, і ў прадпрыемстве, дзе працаваў я, працавала адна полька, новая рэпатрыянтка з СССР. Аднойчы я запытаў яе: „Чаму Вы прыехалі ў Польшчу? Ці Вам дрэнна жылося ў Савецкім Саюзе?" Яна адказала мне так: „Жылося мне ў СССР нядрэнна. Але ў мяне нарадзілася дачка і першае слова, якое яна выгаварыла, было слова няпольскае. Я зразумела, што мне будзе цяжка самой выхаваць яе на польку. Усю ноч я плакала і на наступны дзень пайшла і запісалася на выезд у Польшчу". Я, будучы тады намеснікам дырэктара, акружыў апекай гэтую маці-гераіню. А як вядуць сябе беларускія і іншыя іншамоўныя мацеры, якія нічога не робяць, каб аставіць пасля сябе традыцыйнае патомства? Яны гаворацъ: „Bo im będzie ciężko".

Мая дачка Лена вучылася паралельна ў дзвюх школах: агульнаадукацыйнай і музычнай. У школах і дома, пры дапамозе тэлебачання, чытання „Нівы" і маёй дапамозе, яна авалодала дзяржаўнай польскай мовай, літаратурнай рускай мовай, нямецкай, беларускай і ўкраінскай мовамі, бо вельмі палюбіла ўкраінскія песні. У алімпіядах рускай мовы — школьнай, гарадской, ваяводскай, усяпольскай займала першыя месцы, а ў 1981 г. заняла першае месца ў сусветнай алімпіядзе рускай мовы ў Маскве і атрымала залаты медаль. Чытачы могуць падумаць, што гэтыя вучэнні адбываліся коштам іншых прадметаў. Нічога падобнага. Дачка ў абедзвюх школах у гадавых пасведчаннях не мела троек, чацвёрак, а з усіх прадметаў — выдатна. Праўда, і бацьку прыйшлося давучвацца, каб не адставаць ад дачкі. Закончыўшы кансерваторыю, дачка некалькі гадоў канцэртавала ў Іспаніі і Францыі, дзе авалодала яшчэ іспанскай і французскай мовамі. І ўсім нам, дарослым, таксама трэба ўсё давучвацца, каб ісці нага ў нагу з развіццём падзей.

На нашых вачах пачалася паланізацыя Праваслаўнай царквы ў Польшчы, што выклікае трывогу ў больш адукаваных вернікаў і радавых святароў. У апытанні польскага грамадства толькі 13% апытаных прызналіся да прыязні і шанавання беларусаў, да ўкраінцаў яшчэ менш — 12%, да рускіх трохі больш, але таксама мала — 14%. Як жа ісці католікам з такімі сэрцамі на сумесныя маленні? Польскі эміграцыйны літаратар і публіцыст Гедройц напісаў, што гісторыя ніякай дзяржавы не ёсць так сфальшавана, як гісторыя Польшчы. У польскіх школах, наперакор злачынным фактам праследавання за веру, насаджэння вуніі, захопніцтва чужых зямель на ўсходзе, крывавых падаўленнях паўстанняў на гэтых землях, дапамогі Напалеону ў занявольванні іспанцаў і італьянцаў, разні неграў на Сан-Дамінга і г.д. вучаць польскіх дзяцей, што Польшча заўсёды была талерантнай і нават пры саджанні на кол украінскіх казакоў рацыя была на яе баку. Так выхаваныя маладыя палякі часта бываюць вельмі блізарукімі і лічаць, што калі меншасцей не б'юць, дык сведчыць гэта аб тым, што меншасцям гэтым вельмі добра жывецца.

Мікалай Капчук

Не глядзець на мінулае чужымі вачыма

Нарэшце пра маю родную вёску ў „Ніве" пішуць на першай старонцы. І, як не кажы, ёсць і здымак з назвай вёскі („Ніва", ад 7 снежня 2003 г.). З зацікаўленнем пачаў чытаць я тэкст Аляксея Мароза пра маю вёску і яе жыхароў. Пэўна, калісь гэта была вельмі людная вёска, многа дзяцей, моладзі і пажылых людзей тады было, але ў пахмурнае надвор'е на вуліцы была пустэча як і цяпер. А. Мароз піша, што „сумнымі паказваюцца мне вялікія мураваныя і драўляныя дамы, якія будаваліся дваццаць-трыццаць гадоў таму". Калі чытаю такую канстатацыю, не ведаю, чаму аўтару гэтых слоў вялікія мураваныя і драўляныя дамы паказваюцца сумнымі? Ці таму, што сумнае і пахмурнае надвор'е? Ці таму, што гэтыя вялікія мураваныя і драўляныя дамы стаяць апусцелыя і запушчаныя? А запушчаныя таму, што будаваліся дваццаць-трыццаць гадоў таму? Ці можа таму А. Мароз так напісаў, каб проста падбудаваць свой тэзіс, што беларуская вёска пусцее, старэе і г.д. Думаю, што калі б А. Мароз не ехаў праз Старое Беразова і Махнатае, а затрымаўся і папытаў людзей, калі яны будавалі вялікія мураваныя і драўляныя дамы, то даведаўся б, што некаторыя былі будаваныя не так ужо і даўно. А калі б ехаў, або яшчэ лепш затрымаўся і паглядзеў на нашы вёскі вясной або летам, то не паказаліся б гэтыя шыкарныя дамы сумнымі.

Далей, думаю, што ацэнка гаспадарання якраз у гэтых вёсках больш складаная чым вынікае з артыкула Мароза. Добра, што журналіст, хоць крыху, прыбліжае чытачам „Нівы", чым жыве сучасная вёска. Вёска, дзе ёсць актыўных прынамсі 15 малодшых гаспадароў і дзе няма кавалачка неабробленай зямлі.

Вядома, можна спытаць, каму перашкаджала такое жыццё, калі „многія гаспадары працавалі ў Гайнаўцы або Бельску-Падляшскім... Іх жонкі і дзеці даглядалі жывёлу, куплялі „фіаты", „паланезы" і патрэбную сельгастэхніку... Дзесяцігектарных гаспадарак хапала для дастатковага жыцця. Складанасці паявіліся, калі ў краіне пачаліся перамены." Такі вобраз быўшага жыцця на вёсцы не зусім праўдзівы, бо не заўсёды так было, а дзесяцігектарных гаспадарак не было так многа. Купіць „фіат" ці „паланез", не гаворачы пра сельгастэхніку, было вельмі складана. Без хабараў і блату нічога не можна было купіць. А складанасці паявіліся, бо рэчаіснасць лопнула. Каб штось купіць, хабары і блат ужо не памагалі. Перамены пачаліся, бо паявіліся сур'ёзныя складанасці, а не наадварот. Не ведаю, які ўзрост А. Мароза, але калі ён сам не памятае як было, то павінен прынамсі пачытаць, каб не глядзець на мінулае вачыма сваіх суразмоўцаў.

Міхась Куптэль

Гэта было пад Кёнігсбергам (1)

Расказвае Марфа РАМАНЧУК, жыхарка Кузавы Чаромхаўскай гміны.

Нарадзілася я ў 1925 годзе. Бацька выходзіў з Хлявішчаў, а ў Чаромху прыйшоў у „прыступы". У сям'і я была старэйшая. Мікалай на чатыры гады быў малодшы. Два гады за ім Міхал нарадзіўся. На дзесятым годзіку бацька нас пакінуў. Маці прыняла Аляксандра Касэцкага, каталіка з Кнышына, які працаваў на паравозным дэпо ў Чаромсе. З гэтага сужонства трое дзетак засталося: Генік, Жэня і Вера. Бедна мы жылі, а я, як найстарэйшая, памагала маці.

Гэта было пры немцах. Пасвіла я коней з сяброўкамі за вёскай. З леса выйшлі шасцярых мужчын. Падышлі да нас, пыталі адкуль мы, як часта прыганяем коней на пашу. Затым папрасілі прынесці бульбы. З таго часу я з „ляснымі" сустракалася, прыносіла ежу. Запамяталіся іх тры імёны: Сцяпан, Іван і Васіль.

У Нямеччыну забіралі ў 1943 годе. У спіску выпадкова аказалася, бо павестку прыслалі солтысавай суседцы. Яе бацька паклапаціўся, каб іншую паслалі. Прыйшоў солтыс з жандарам, агледзелі мяне з ног да галавы. Немец ляпнуў па плечах. — „Гут", — сказаў.

Міран Кердалевіч, якога Міронікам называлі, раней быў вывезены на работу. У вёску прыехаў як элегантны панок, у модным капелюшы і добра апрануты. Хлопцам расказваў, як добра жывецца ў Нямеччыне. Прапанаваў ехаць з ім на работу. Паколькі ахвотных не знайшоў, дык у Кляшчэлі да камісара паехаў. Неўзабаве павесткі атрымалі Ян Панасюк, Сцяпан Ляўчук, Вера ды Люба Внучка і Люба Міркоўская.

У Кляшчэлі пайшла я пешшу. Было гэта 28 студзеня 1943 года. Сабралі ўсіх у жыдоўскай бажніцы. Ноч пратрымалі,

Фота УЛАДЗІМІРА СІДАРУКА

а раніцай у Бельск павезлі. Памясцілі ў шопе, пасля ў лазню пагналі, адзенне дэзінфіцыравалі. Перад камісіяй у трусіках паставілі. Лекар прыкмеціў шрамы на калені. Запытаў ад чаго яны, а калі я сказала, што ад укусу сабакі, дык штосьці ў паперах запісаў (немцы баяліся інфекцыйных хвароб). На камісіі сустрэла я сяброўку з вёскі. Оля галаву мела закутаную вялікім шалем. Як зайшла ў залу, дык сказалі ёй распрануцца. Лекары ўбачылі абстрыжаную галаву і вылупістыя вочы дзяўчыны. Замахалі рукамі і загадалі выносіцца прэч. Выходзячы, хітрунка па-шэльмаўску міргнула з усмешкай. Пасля мне маці пісала, што Олю не забралі, бо на тыф хворая.

У Бельску пагрузілі нас у таварныя вагоны. Спадарожнічала з Юлькай Ваўрыновіч з Дашоў і Сашам Мацкевічам з Доўгага Броду. Юля моцна плакала. Наракала, што матулю пакінула. Мы разважвалі, але яна не слухала. Усю дарогу залівалася слязмі. Праз акенца за кратай ледзь прабіваліся мізэрныя цені студзеньскага дня. Душна было і заносіла потам. Вагоны былі закрыты і пільнавалі іх вартаўнікі. У Беластоку цягнік папоўнілі „навабранцамі" і далей паехалі. Двух хлопцаў задумалі ўцячы. Дошкі ў падлозе прарэзалі, а нам сказалі бокам абыходзіць, каб не праваліцца. Пасля пачуліся выстралы, але цягнік не спыняўся. Хто да каго страляў, дык невядома. У вагоне хлопцаў не было. Пралом віднеў у падлозе.

У час далейшага падарожжа два разы яшчэ хадзілі ў лазню. Раз былі ў Элку. Назву другога горада не запамятала. Адно здарэнне ўспомніла. Як загналі пад душ, дык моцна гарачую ваду пусцілі. Адна з нашых схапіла стаяўшую побач немку, якая за намі наглядала і зацягнула пад кіпяток. Гвалт учыніўся. Прыбег тоўсты немец і высветліўшы справу, пасварыў наглядчыцу.

Выгружаліся на станцыі Ворбліт. Завялі ў арбайтсамт, адкуль гаспадары забіралі. Я была мізэрнай дзяўчынкай, сорак чатыры кілаграмы важыла. Сяброўкі лепш прэзентаваліся і на іх хутчэй „купцы" знайшліся. Калі я адна засталася, дык плакаць стала, прасіла з сяброўкамі паслаць. Тады падышла Агата — трыццаціпяцігадовая старая панна. Жыла яна з братам Францам і старэнькімі бацькамі. Бацька таксама Франц называўся. Брат кавалер. Яму сорак пяць гадоў было, а бацькам далёка за восемдзесят.

Гаспадарку невялікую мелі: дом, абора і стадола — мураваныя. У кароўніку чатыры каровы, ялаўняк, дзве пары коней і васемнаццаць свіней. Жывёла на ланцугах прычэплена стаяла. Штодзень гнаявую жыжку і гной вывозілі. Два вепручкі ў год забівалі: пад Каляды і Вялікдзень. Дазвалялася гэта, паколькі ў маёнтку наёмныя работнікі працавалі.

Да майго прыезду ў гаспадарцы памагаў Аляксандр — палонны паляк з Ломжы. У палон трапіў у трыццаць дзевятым. Раней працаваў у іншага гаспадара. Уцёк ад яго. Злапалі. Французам прызначылі. Быў пад наглядам жандараў. Гаварыў, што дома двух сыноў і дачку ў маім узросце пакінуў. Аляксандр даглядаў коней, гной вывозіў і працаваў у полі. Я памагала Агаце. Кароў даіла, свіней карміла, буракі палола. Малако Франц у малачарню адвозіў — рана і адвячоркам, па дваццаць літраў.

Адвялі мне куточак пры калідоры. З процілеглага боку пакой Агаты змяшчаўся. Побач — бацькоў і брата. Кватэра Аляксандра знаходзілася над склепам, як на паддашак заходзіць. Дзве ступенькі вышэй нада мною. Акно было за кратамі, дзверы абітыя бляхай. У верхняй частцы дома былі два памяшканні. Ніколі туды не заглядала. У суседзяў на хутары працаваў палонны француз.

Агата была добрасумленнай і зычлівай паненкай. Не цярпела хлусні. Да майго прыезду пяць служанак адправіла — дзве палячкі, дзве літоўкі і немку. Не спраўляліся ды не давярала ім. Мяне „на пробу" выстаўляла. Падкладала асабістыя рэчы і глядзела ці не вазьму іх. Кожную знаходку я звяртала, пры чым казала, дзе яе знаходзіла. Праз два гады даверам пані карысталася.

Папрасіў Аляксандр мяне ўзяць яму дзесяць яек з куратніка. Не разумела ідэі, дзеля чаго гэта зрабіў. Мне здавалася, што хацеў выставіць перад Агатай. Калі адмовілася, дык згвалтаваць хацеў. Паненка абараніла. Наступнага дня кароў абедзве даілі. Аляксандр пракраўся ў кароўнік. Падышоў ціхачом ззаду і ўрэзаў Агату ў галаву бручкай. Асунулася непрытомная. Нахабнік уцёк з перапуду. Агата, ачнуўшыся, загадала выдаіць рэшту кароў, а сама ўзяўшы ровар, у вёску падалася. Неўзабаве прыехалі жандары на машыне. Аляксандра закавалі ў кайданы. Ад'язджаючы, кінуў злосна ў мой бок: „Zapamiętaj k..., będą z ciebie jeszcze skórę drzeć". З таго часу след па Аляксандру загінуў.

(працяг будзе)

Запісаў Уладзімір СІДАРУК

Плён VIII Агульнапольскага конкурсу беларускай паэзіі і прозы

Заварожанае хвалямі дзяцінства

Адкуль тэма?

Рышард Бутайла напісаў мне калісьці, што ён успамінаў не любіць. „Бо ўспаміны крыўднага здарэння абнаўляюць боль незагоенай раны. Успамін мілых фактаў, дастаўляе боль свядомасці, што перажыць тое, што мінула, не будзе нам дадзена". Цяжка з гэтым згадзіцца. Хай яно і праўда, што ў жыцці няма нічога трывалага. Але ж, калі б мы гісторыю не запісвалі, калі б не праяўлялі клопату пра нашы дасягненні, чалавецтва не зрабіла б ніякага кроку наперад ані ў галіне навукі, ані ў палепшэнні жыцця, ані тым больш у культуры. Памяць, успаміны мінулага, у маім адчуванні гэта (быццам) паэзія ў адносінах да бягучага, штодзённага жыцця. Асабліва ўспаміны з маленства...

Узрасласць, мудрасць, веды, мы здабываем паступова маленькімі глыткамі. Наш свет пачаткова таксама маленькі, як мы самі. Калі мы большыя — нашы веды пра жыццё багацейшыя. І ці ж успаміны гэта не здольнасць перажываць — яшчэ раз — ужо пражытае? Паддавацца рэфлексіям, рабіць высновы нават на будучыню? На дадатак развіццё ў галіне фатаграфіі і запісі гукаў прыходзіць к нам з дапамогай у „вяртанні" мінулага — ну, хаця і частковым. А я гэтым захапляюся.

Так склалася, што пад канец мінулага года атрымаў я ад знаёмай ліст, у якім яна піша, што польскае радыё падало да ведама, быццам беларускія вучоныя вызначылі новую сярэдзіну Еўропы. Цэнтр яе знаходзіцца ў Беларусі між Зябкамі, возерам Шо і Псуяй. І хопіць глянуць на карту Глыбоччыны: мы ў паказаным „трохвугольніку" пабачым найглыбейшае ў Беларусі Доўгае возера. Такая, неспадзяваная вестка распальвае ўяўленні, абуджае ўспаміны пра знаёмыя з маленства мясціны, і пра былое... А тая знаёмая, што напісала мне пра гэта здарэнне ліст, гэта пані Ірэна, дачка настаўніцы, прозвішчам Жэмайтыс, якая некалі вучыла мяне, калі я хадзіў у Псую ў школу. Калі гэта было? Паўстагоддзя з гакам — як некалі казалі. За такі час можна пра ўсё забыцца, тым больш, калі чалавек ад усяго далёка. А тут сама мінуўшчына нас адшукаць здолела і аб сабе прыпомніла. Гэта ўзрушае, расчульвае, прымушае да роздуму. Значыць, ані я, ані мая знаёмая, не можам да прошлага аставацца абыякавымі. І гэта было б лагічным. Кожны з нас пакідае па сабе нейкі след. Гэтыя сляды могуць вызначыць нейкую сцежку, стацца шырокай дарогай, а хаця б і паказальнікам напрамку для заблуканых па дарогах жыцця вандроўнікаў.

Фота МІРЫ ЛУКШЫ

А якімі дарогамі хадзіў я дагэтуль? Што прыгадаць дазволіць мне яшчэ памяць?

Мае „карані"

Вёска наша — Абруб — на Псуеўшчыне, ляжыць каля возера. За возерам быў двор: Псуя, маёнтак пана Косава. На пачатку, на колькі мяркую, мяне цікавіла толькі тое, што адбывалася на панадворку, ці ў агародзе за хлявамі. У агародзе раслі агуркі, памідоры. Больш там, пэўна, і іншых раслінак бывала, але ці я, чатырохгадовы хлапчук, імі тады цікавіўся. Во, расла там недзе і крапіва, толькі ніяк я яе не ўмеў адрозніць ад іншага зелля. Таму слухаў дарослых, што без іх мне самому нікуды ісці не трэба, бо я маленькі. Крыху было крыўдна. Кот жа быў меншы за мяне, а мог пайсці або палезці куды хацеў. Толькі дружба з катом не была лёгкая. Кот любіў грэцца на сонейку, а мне сядзець каля яго нерухома не хацелася.

Вось на другім баку вуліцы было цікавей. Там, на дрэвах віселі яблыкі, грушы. Скакалі птушкі па галінках. Яны лёталі і на ток каля пуні. Але мне і туды самому хадзіць не дазвалялі. Тым больш, што ў вёсцы назіралася незвычайная мітусня. Прыязджалі сюды незнаёмыя людзі, хадзілі па вуліцы, па нівах, нешта глядзелі, нешта мерылі. А нават у дзядзькі Юстына нейкі час жыў чалавек (з сям'ёй), якога каморнікам звалі. А ён таксама і ў лазню хадзіў мыцца. Толькі не з мужыкамі, але з жонкай і дзеткамі. Вяскоўцы дзівавaліся: а якія ж у гарадскіх норавы дзікунскія. На полі ставіліся да яго ветліва і пакорліва нават.

У нас, гэта ў дзядзькоў, была таксама лазня. Мыцца я хадзіў з бацькам — іншыя дзеці мыліся з бабамі. Для мяне бацька браў начоўкі, дарослыя мыліся ў драўляных вядзерцах. А ў лазні было горача, калі мужчыны хвасталіся бярозавымі венікамі. Венікі перш мачылі ў бочцы, у гарачай вадзе, а потым лезлі на палок, дзе яшчэ больш горача было.

У вёсцы, пакуль што, усё адбывалася нармальна. Кожную раніцу пастух трубіў у трубку, каб гаспадыні кароў выганялі на вуліцу. (А я марыў, каб мець такую трубку, скручаную з альховай кары. Вось была б радасць). Гаспадары запрагалі коней у калёсы і штодзённа ехалі некуды. І доўга гэта так трывала. Урэшце мне бабуля сказала, што хутка вёску разбяруць і раскінуць па ўсім полі. А калі я не разумеў як гэта станецца, сказала: кожны возьме з вёскі сваю хату і паставіць яе на свой хутар. Так яно менш-больш і адбылося.

(працяг будзе)

Анатоль МАЎЧУН

З месячнага боку

Дарагая Домна! Я ў сне — у суседняй вёсцы, на падворку пані Ганны (ужо не жыве). Сцежкі ад брамкі параслі такой гушчавінай язмінаў, што цяжка праз іх прадзерціся (восень, на карычневых мокрых галінах няма лісця ні цвету). Тое ж самае — на вуліцы. Кажу суседзям: як вы можаце так жыць, нічога з гэтымі галінамі не робіце? І заплятаю іх усе ў прыгожыя косы, ад карэння да галін (а яны высокія, як яблыні), пад якімі можна праходзіць.

Далей іду па вёсцы, у напрамку лесу (ён зачынаецца зараз за вёскай). Са мною — нейкае дзіця, здаецца, гэта трынаццацігадовы сваяк. На полі бачу грудок — на гняздзе сядзіць вялікая перапёлка. Рашаю забраць ёй птушанят. Перапёлка збягае з гнязда, пачынае з крыкам уцякаць, хоча адвярнуць маю ўвагу ад дзяцей. Кажу хлопчыку: я пакіну ёй двое. Згортваю птушанят у падол швэдра (іх вельмі шмат), у гняздзе застаецца 10 перапёлачак. Азіраюся — непадалёк ад нас крадзецца вялізны кот. Думаю аб тым, каб ён не паеў пакінутых мною птушак.

Марына

Дарагая Марынка! Не адна жанчына можа пазайздросціць табе духовае красы, шмат у тваім сне сведчыць аб тваёй жаноцкасці. Твая жаноцкая натура ў найбліжэйшы час будзе для цябе найважнейшая. Гэта дасць табе сілу і павядзе ў новы шлях. Мэта жанчыны — ахоўваць жыццё. Ты ў шмат якіх сітуацыях у сне — жанчына-ахоўніца. Твой сон — поўны універсальных сімвалаў, напр., дрэва. Як дрэвы, маем магчымасць адраджацца — вяртацца да жыцця, на псіхічную вясну пасля зімы. Яшчэ не пара квітнець і даваць плады, але ты ўжо пачынаеш парадкаванне. Ты — як маці, якая пляце косы сваім дочкам. Каб прайсці да новага трэба ўпарадкаваць мінулае. Жыццёвую трансфармацыю прадказвае таксама другая частка сну. Важна „13" — сімвал вялікай жыццёвай перамены... Не заўсёды ведаем, які сэнс нашых дзеянняў. Ты не ведаеш, чаму забіраеш дзяцей перапёлцы. Дзейнічаеш згодна са сваёй воляй, спачатку больш інтуітыўна, чым свядома. Голас інтуіцыі падказвае — ахоўваеш птушак ад ката, які мог бы іх паесць... Птушкі ў нашых снах паказваюць нас. Твая несвядомасць, каб паказаць, хто ты ёсць, выбрала перапёлку, якая жыве іначай чым іншыя птушкі. Асацыюецца з палётам, паветрам, але гняздо мае на зямлі. Выносячы птушанят, ахоўваеш частку сябе самой ад пагрозы. Думаю, што ты, як птушка гняздо, усё ўважлівей будуеш сваё пачуццё бяспекі для сваіх блізкіх, але напачатку трэба ахоўваць перш за ўсё сябе. Гэты сон паказвае табе таксама напрамкі, паколькі ты — мастачка. Птушка — сімвал палёту, натхнення. Твае думкі, мабыць, як тая перапёлка, заблізка зямлі. Птах, як і талент, да жыцця і развою патрабуе свабоды, паветра, прасторы. Сніцца табе лес — прагнеш рэалізацыі спраў сапраўды важных, ідэалаў, якія ты магла была палічыць за малажыццёвыя. Мабыць, варта да іх вярнуцца.

Домна (domnason@wp.pl)

Разважанні аб злачынцах

Падарожнічаў я аднойчы з вязнем, які карыстаючыся пропускам, ехаў дамоў наведаць матулю.

— У турме рай, — гаварыў суразмоўца. — Працаваць не застаўляюць. Харчуюць добра. Газеты, тэлебачанне. Да поўначы „плейбоі" аглядаем. Каб яшчэ нанач кабету давалі, жыць — не паміраць!

Вось што гаварыў генеральны дырэктар турэмнай стражы: ген. Ян Пырцак у інтэрв'ю для Рэгіянальнай тройкі:

— У перыядзе чатырох гадоў (1999-2003) злачыннасць увялічылася на 50%. Старыя турэмныя будынкі памятаюць часы першай сусветнай вайны. Перапоўненыя. На аднаго зняволенага выпадае 2,5-3 квадратных метраў жылога памяшкання, паколькі ў Еўрасаюзе норма назначаецца 8-10 метраў. Суды не спраўляюцца з разборам спраў. Чатыры тысячы падсудных чакае выканання прыгавору. Не хапае грошай на ўсё. Адно за перапрацаваныя звыш нормы гадзіны, стражнікам вінаваты два мільёны злотых. А на 2004 год, паводле плана Ежы Гаўзнера, прадбачваецца „абрэзаць" і так малы бюджэт.

Па статыстыцы на вязня з дзяржаўнага бюджэту (грошай падаткаплацельшчыкаў) выдаецца 1 380 зл., паколькі сельскагаспадарчая пенсія ў сярэднім складае суму 400-600 зл. Якая ж тады справядлівасць? Злачынца жыве ў дастатку (зважыўшы сказанае маім суразмоўцам), а селяніну, які працуе ад світання да змроку ледзь трэцяя частка дастаецца таго, што атрымоўвае вязень. А што скажуць бяздомныя, якія даху над галавой не маюць, ці беспрацоўныя, якім прыходзіцца абяспечыць некалькіасабовую сям'ю. На маю думку, законы павінны быць зменены. Грамадскасць не будзе адчуваць сябе бяспечна, пакуль злачынцы не адчуюць пакарання. Ген. Пырцак разважаючы справу выканання прыгавораў падсуднымі за меншыя злачынствы прапанаваў, каб зняволеныя выконвалі працу на карысць грамадства ў публічных месцах. Карысць была б двухбаковая: самаўрады зберагліб грошы, якія выдаюцца на інтэрвенцыйныя работы, а зняволены адчуў бы кару (сорам перад знаёмымі). Адно можна сказаць: калі палітыкі ад палымяных перадвыбарчых лозунгаў не пяройдуць да дзейнасці (устанаўленне законаў і прывядзенне іх у сілу) грамадскасць не будзе адчуваць сябе бяспечнай.

Уладзімір Сідарук

Фота Аляксея Мароза

З новага магазіна пакупнікі выходзілі з вялікімі сумкамі і паветранымі шарамі

Новы маркет

Многа гасцей запрасіла 9 снежня кіраўніцтва ПСС „Сполэм" на афіцыйнае адкрыццё новага магазіна ў Гайнаўцы распаложанага па вуліцы Баторыя. Сярод іх былі намеснік ваяводы Ежы Паўяновіч, стараста Уладзімір Пятрочук і старшыня Гарадской рады ў Гайнаўцы Якуб Астапчук. Мерапрыемства супала са святкаваннямі васьмідзесяцігоддзя кааператыва „Сполэм". Новы магазін займае плошчу звыш 1600 квадратных метраў. Каб прыцягнуць пакупнікоў кіраўніцтва рашылася панізіць на некалькі працэнтаў цэны на прадукты ў гэтым магазіне, у параўнанні з цэнамі ў іншых магазінах кааператыва. У новым маркеце знайшло работу каля 30 асоб, а ўся інвестыцыя, якая рэалізавалася 4 месяцы, каштавала каля 3 мільёнаў злотых.

— Мы заўважылі, што жыхары горада патрабуюць вялікага сучаснага магазіна, у якім маглі б купляць усе патрэбныя прадукты харчавання, — сказала старшыня ўправы ПСС „Сполэм" у Гайнаўцы Мечыслава Багдановіч. Намеснік ваяводы Ежы Паўяновіч заявіў, што ў гарадах такой велічыні, як Гайнаўка, маркеты маюць шанц развівацца, таму што жыхары ахвотна купляюць у вялікіх магазінах. У гайнаўскім новым магазіне для пакупнікоў прапануецца каля 10 тысяч прадуктаў.

— Добра, што адкрылі маркет, бо тут вялікі выбар і цэны крыху ніжэйшыя, чым у іншых магазінах. Абслуга прыемная і прыгожы ўнутраны выгляд. Я буду заходзіць у маркет, бо ён распаложаны па дарозе на работу. Найбольш цікавяць мяне прадукты харчавання і санітарныя вырабы. Можа ён крыху замалы. Калі б быў большы, быў бы яшчэ большы выбар, — заявіла асоба, якая прыйшла ў магазін у першы дзень яго працы. — Калі ўласнікі малых магазінаў панізяць цэны, да іх таксама будзе прыходзіць больш пакупнікоў.

Метраў 100-200 побач хутка будуецца чарговы маркет, які плошчай будзе большы ад кааператыўнага. Гэта супраць яго будове пратэставалі ўласнікі гайнаўскіх магазінаў і працаўнікі кааператыва „Сполэм". Каб не будавалі чарговых вялікіх магазінаў, радныя Гайнаўкі прынялі асобную пастанову. Не дазваляе яна адкрываць у Гайнаўцы крамы плошчай большай за 400 квадратных метраў. Зараз многа жыхароў Гайнаўкі станоўча ацэньвае будову вялікіх магазінаў. Аднак тыя асобы, якія не ездзілі ў беластоцкія маркеты, могуць быць расчараванымі першымі пакупкамі танных прадуктаў. Каляровыя ўпакоўкі і ніжэйшыя цэны заахвочваюць браць многа і толькі пры касе пакупнікі здзіўляюцца вялікімі сумамі, якія трэба заплаціць за выбраныя прадукты. Дома аказваецца, што некаторыя прадукты будуць малапрыдатнымі, а іншыя доўга лежачы могуць сапсавацца. Едучы ў вялікія магазіны добра зрабіць спісак прадуктаў, якія хочам купіць і яго трымацца.

Аляксей Мароз

Мікалай Панфілюк

З надзеяй сустрэнем Новы год

Прайшоў стары год,
Было шмат прыгод,
Жылі мы ў грамадзе,
У радасці і жудзе.

Наступіў Новы год —
Трымайся, беларускі род!
Жыві бадзёра,
Не бойся гора.

Веру мацуй,
Сэрца не шкадуй.
Бліжнім і варожым
Спагадай, магутны Божа.

Каб у гэтым новым годзе
Жыць нам у свабодзе,
Каб родная мова расцвітала
І добры плён давала.

Каб у кожнай хаце,
Дарагія сястра і браце,
Дружна жыць і не лянiва —
Разам з роднай нашай „Нівай"!

Ніва ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

Nakład: 1 393 egz.
Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Мірановіч.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 149.
Тэл./факс: (0 10xx 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*

Zrealizowano przy pomocy finansowej Ministerstwa Kultury.
Галоўны рэдактар: Віталь Луба.
Сакратар рэдакцыі: Аляксандр Максімюк.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Ада Чачуга, Паўліна Шафран.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Камп'ютэрны набор: Яўгенія Палоцкая, Марыя Федарук.
Друкарня: „Orthdruk", ul. Składowa 9, Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata: 1. Termin wpłat na prenumeratę na II kwartał 2004 r. upływa 5 marca 2004 r. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie woj. podlaskiego i oddziały „Ruch" na terenie całego kraju.
2. Cena prenumeraty na II kwartał 2004 r. wynosi 26,00 zł.
3. Cena kwartalnej prenumeraty z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 120,00; pocztą lotniczą Europa — 133,00; Ameryka Płn., Płd., Środk., Afryka, Azja, Australia — 147,00. Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A., Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa, Pekao S.A., IV O/Warszawa, Nr 68124010531111000004430494.
4. Prenumeratę można zamówić w redakcji. Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 3,40 zł, a kwartalnie — 44,20 zł; z wysyłką za granicę pocztą zwykłą — 4,70 (kwartalnie — 61,10), pocztą priorytetową: Europa — 5,90 (76,70), Ameryka Płn., Afryka — 6,60 (85,80), Ameryka Płd., Środk., Azja — 7,40 (96,20), Australia — 9,60 (124,80). Wpłaty przyjmuje Rada Programowa Tygodnika „Niwa", Białystok, ul. Zamenhofa 27, nr konta BPH PBK SA Oddział w Białymstoku 77 1060 0076 0000 4011 5001 5504.

Н!ўка

Фота http://anyfun.net/

Сапраўдны рускі кот

„Даўціпы” *Андрэя Гаўрылюка*

Жонка, вярнуўшыся з працы села на тапчан і кажа мужу, які чысціць падлогу:

— Мой дырэктар сказаў, што развёўся б для мяне, але ён хіба жартуе?..

— А мо гаварыў усур'ёз? — з надзеяй перапытвае муж.

* * *

Дырэктар уваходзіць у бюро і бачыць як адзін з ягоных працаўнікоў абцалоўвае сакратарку.

— Ці я вам плачу за гэта? — пытае.

— Не, я гэта раблю бясплатна.

* * *

Гутараць дзве сяброўкі:

— Мы ўжо пяць гадоў пасля шлюбу, а ўсё яшчэ не маем дзяцей.

— А ці ведаеш хаця, па чыёй віне?

— Гэта ўсё праз мужа — ён не пускае мяне адной з дому.

* * *

Сакратарка ўваходзіць у кабінет дырэктара разам са сваім нарачоным:

— Выбачайце мне, дырэктар, што прыходжу з нарачоным. Ён вельмі раўнівы і не верыць, што вы лысы і прышчаваты.

* * *

Унучак залажыўся з дзедкам на пяцьдзесят еўра, што ўб'е дажджавога чарвяка ў дошку. Памазаў яго спецыяльным лакам і калі лак сцвярдзеў, без цяжкасці ўбіў чарвяка. Унучак выйграў.

— Дай мне гэты лак, — кажа дзедка, — а я расплачуся з табою заўтра.

На другі дзень:

— На табе пяцьдзесят еўра ад мяне, — кажа дзедка, — і яшчэ сто ад бабулі.

* * *

Гутараць дзве знаёмыя:

— Маю дачку нехта спакусіў, — кажа адна, — і яна зацяжарыла, а я шукаю бацьку яе дзіцяці.

— Яшчэ не знайшла?

— Траіх ужо ёсць, але магчыма, што будзе іх больш.

* * *

Катэхетка тлумачыць дзецям у школе, што людзі паходзяць ад Адама і Евы.

— Гэта няпраўда, — пратэстуе Янка, — бо мой татка гаворыць, што мы паходзім ад малпаў.

— Запомні, — павучае настаўніца, — што ў вашы сямейныя справы школа не ўмешваецца.

* * *

— Ці твайму мужу здарылася калі-небудзь не вярнуцца нанач дадому?

— Толькі адзін раз: месяц пасля нашага шлюбу. Але ўвесь час маю надзею, што ён усё ж вернецца.

* * *

— Ці здарылася калі табе, — пытае Маруся сяброўку, — каб твой муж засціг цябе з чужым мужчынам у ложку?

— Ніколі! Заўсёды гэта былі яго сябры.

Якім будзе год

Няма як шчыраму верніку гуляць у пост. А тут, на табе — увесь горад святкуе, ледзь не трэсне, а ты з сухой пысаю глядзіш у тэлевізар. Папраўдзе, і ў тэлевізар не выпадае глядзець — такое там паказваюць. А калі яшчэ пакажуць пра каханне... Хоць ты плач. Што мне элекронныя лісты ад Агаты, яе пасылкі з цёплымі трусамі (намёк, ці што?), калі няма кабеты. Яно, можна, кажа Збышка Насквaрка, справу аформіць, ды ён так сабе кажа, бо ягоная Тамарка з ім дзень і ноч. А Мікола Здунюк... Кажа, чуеце, зробім балецікі, ніхто і ведаць не будзе. Адно паглядзіш, Вандал, ніякага грэху не будзе. Прывязем пару дзяўчынак, паразмаўляем, пачастуем. Сведкай будзе МакХолад, ён хлопец прыстойны. А разагрэешся!

А што вы кажаце! Гэта ж проста распуста! Каб я клікаў дзяўчат, плаціў ім за кампанію, ды глядзеў разам з імі ў тэлевізар?! Ага, і паваражыць можна ў шчодры вечар, кажа Міколка. Дзяўчаты гэта любяць.

Прыехалі тры паненкі, зусім маладзенькія. Накарміў я іх, разам з намі паелі і мае сябры. МакХолад сядзіць, п'е гарбату — качаецца ад смеху. А мы пачалі варожбы.

Ганя, Кася і Ізабела, бо гэтак іх звалі, паскідалі чаравічкі. Сталі забаўляцца з Гарэшкай. А я ўзяў гаршчочак з галушкамі:

— Бярыце, дзяўчаты, па галушцы, кладзіце ля парога. Якую мая сучка першую з'есць, тая першай замуж пойдзе.

Пераглянуліся паненкі, бачу, у аднае сляза ўваччу закуцілася. Кладуць галушкі на „Кур'ер паранны” — каб падлогі не запэцкаць. Схапіла адну галушку Гарэшка, хацела каўтануць, ды перадумала. Паклала яе назад, схапіла сярэднюю ды панесла на кухню. Ды яе там не з'ела, а засунула за шафку, на чорную сабачую гадзіну. Вянулася, пакаштавала другую, раз укусіла ды кінула. Трэццю праглынула.

— Ой, з гэтым вашым замужжам неяк нецікава... — прамармытаў Збышка. — Адна зачатая, другую запхнулі ў куток...

— А іншыя варожбы? — пацікавіўся МакХолад, якога ўжо не абаязваў пост — свае святы адсвяткаваў ужо, і завінціў бутэльку, каб нас не правакаваць.

— Баляскі можна лічыць — дзе парная, дзе няпарная...

— Дзе тут баляскі! Хіба што там каля скупкі шклатары...

— Не, не будзем выходзіць на падворак, яшчэ нам паненкі паўцякаюць, узяўшы заранёў грошы, — спахапіўся Міколка.

— Бяры цыбулю, Ізачка, разрэж яе на дванаццаць кольцаў, — падаў я паненцы вялікую цыбуліну.

Іза ў слязах няроўна парэзала цыбулю.

— Вось: студзень, люты, сакавік, красавік, травень... Будзем глядзець, якое кольца запатнее, той месяц будзе мокры... Такі будзе, вось, год.

— Я думала, што пра замужжа! — злосна панюхала свае пальцы дама.

— Дык, можа, варожбу з боцікамі? Здымайце туфелькі, дзяўчаткі, і стаўце іх па чарзе, адну за адной, аж да дзвярэй. Якая першая будзе пад дзвярыма, тая і першая пойдзе замуж...

Ізіна туфелька, Ганіна, Касіна, Ізіна, Ганіна, Касіна, Ізіна, Касіна, Ганіна...

Тут паненкі схапілі сваё верхняе адзенне, што вісела ля дзвярэй, і толькі мы іх бачылі.

— Во, хлопцы, так заўсёды з гэтымі паненкамі, — пасміхнуўся МакХолад, які ніколі не посціць.

Вандал Арлянскі

Дзе Усход сустракаецца з Захадам

Białystok. Kiedy zapada zmrok, w mieście otoczonym puszczą słychać odgłosy dzikiego lasu. Obok chat krytych strzechą stoi pałac nazywany niegdyś polskim Wersalem. Tutaj Wschód spotyka się z Zachodem. (Voyage, 11. 2003).

Пушча цемрыцца навокал.
У змрочных нетрах белы сток.
Тут сустрэўся вока ў вока
З Захадам дзікі Ўсход.

Буданы саломай крыты.
Такая традыцыя.
На рацэ Белай у карытах
Жвавяцца тубыльцы.

Вязуць пітво, вязуць песні
У палац „Wersalski”.
І былое ўваскрэсне,
І лад будзе saski.

За палацам воўча зграя
Ўсіх збівае з тропу:
— Досыць лесу! — узвывае.
— Давай Еўропу!

Сідар Макацёр

Адгаданка

Зімовая кузня

(паліндрам)

Па палярным небе, прыпрэжана ў Вялікі Воз,
Малая Мядзведзіца манежыць завеі ў мех.
Трашчыць пад яркімі __ __ __ __ __ __ __ / __ __ __ __ __ __ __,
Скоўвае ён лёд стальны. Іскрыцца снег...

(Ш)

Рашэннем паліндрама з'яўляецца словазлучэнне, якое чытаецца аднолькава злева направа і справа налева, напр. *пчолка* **ПІЛА ЛІП** *нектар*.

Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя рашэнні, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 46 нумара

Цацка, павець, заяц, рывок, Вішы, Рыга.

Рашэнне: **Выпівака грашыць, цвярозы каецца**.

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** з Беластока і **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў.

Усебаковы каментатар

Каментатар футбольных матчаў часта паміж радкамі, бы тыя кантрабандысты цераз мяжу, перакідваюць змест, якога не адважыліся б падаць палітычныя назіральнікі. Вось, на матчы Манчэстэр-Сіці — Гроклін перадаючы спаборніцтва асцерагаў:

— Паўляк шалёны ад злосці. Паўляк вяртаецца ў ігру.

Футбаліст Паўляк вярнуўся. А ці „той другі” зноўку вернецца?

Каментатар у іншы момант матча заявіў:

— Будзем мець чарговы рагавы ўдар (корнер) для спаборнікаў нашага клуба.

Цікава, як выглядаў бы наш рагавы ўдар праціўніку.

У другой палове матча азвалася ў ім душа мастака:

— Танцуюць цяпер футбалісты, значыць, балельшчыкі.

Значыць, не так і страшна з гэтым адзічэннем фанатаў, калі футбольныя жарсці выклікаюць у іх балетна-мастацкія зрухі.

У кожную хвіліну аб сітуацыі на футбольным полі, на якім пануюць польскія футбалісты:

— Заяц сядзіць на спіне праціўніка.

Зараз пасля:

— Казёл гоніць Зайца.

А хай цябе, Заяц!

Урэшце ў фінале спаборніцтва адкрыў ён новы часавы прынцып, чаго мог бы пазайздросціць яму сам Эйнштэйн:

— Уцякаюць секунды Манчэстэра.

Палякам секунды не ўцякалі. Былі, мабыць, у іншым часавым вымярэнні, дзякуючы чаму матч закончыўся нічыёй (1:1), для задавальнення захопленых у танцы футбалістаў, значыць, фанатаў.

Значыць, Фанат

ISSN 0546-1960